

Карабель для шчырых сэрцаў



Каб быў музей на радзіме класіка

СТАР. 5



Маёнтак адшукала… настаўніца

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЖНІЎНЯ 2016 г. СЕРАДА № 147 (28257)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# АСАБЛІВАЯ ЎВАГА ДЗЯРЖАВЫ

**Пытанні ўдасканалення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнай падтрымкі насельніцтва разгледжаны 2 жніўня ў час даклада Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяны Шчоткінай.**

Як паведаміў карэспандэнт БЕЛТА, кіраўнік дзяржавы падрабязна цікавіўся ўсімі пытаннямі, звязанымі з пенсійным забеспячэннем: як растуць пенсіі, якія ёсць прапановы па іх павышэнні, які стан фонду сацабароны. Былі разгледжаны некаторыя аспекты занятасці насельніцтва: узровень беспрацоўя, колькасць вакансій, перанавучанне кадраў. Акрамя таго, абмяркоўвалася своечасовасць выплаты заработнай платы па канкрэтных праблемных прадпрыемствах. Прэзідэнт запатрабаваў, каб пытанням выплаты заработнай платы, а таксама пенсій, адраснай сацыяльнай дапамогі ўдзялялася самая пільная ўвага.

Размова ішла таксама аб дзейнасці прадпрыемстваў, якія падведамныя Беларускаму таварыству інвалідаў, і аб тым, як у краіне праводзіцца аздараўленне пажылых грамадзян і інвалідаў.

Разглядалася і дэмаграфічная сітуацыя. Прэзідэнт праінфармаваны, як ажыццяўляецца выплата дапамог сем'ям, у якіх нараджаюцца дзеці. Так, за першае паўгоддзе ў краіне нарадзілася на 1718 дзяцей больш, чым за аналагічны перыяд 2015 года. Паводле слоў міністра, усе дапамогі выплачваюцца ў поўным аб'ёме і своечасова.

Таксама разгледжаны праект указа «Аб пенсійным забеспячэнні асобных катэгорый ваеннаслужачых» і некаторыя пытанні вылічэння стажу дзяржслужачых.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў падыходзіць вельмі ўзважана і акуратна пры разглядзе розных выключэнняў і льгот для асобных катэгорый грамадзян. «Вы ведаеце мае патрабаванні — што датычыцца грашовых пытанняў, асабліва нейкіх выключэнняў, заахвочванняў, ільгот, тут трэба дзейнічаць акуратна, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — І справа не ў тым, што шкада дапамагчы людзям. Галоўнае, каб мы зноў не разбалансавалі сістэму: таму што кагосьці падтрымалі, камусьці льготы прадаставілі — пакрыўдзіліся астатнія катэгорыі. Таму я вас запрасіў, каб вы далажылі мне аб гэтых дакументах — навошта яны патрэбны і ў што выльецца фінансава іх рэалізацыя».

Як праінфармавала Марыяна Шчоткіна, праект указа «Аб пенсійным забеспячэнні асобных катэгорый ваеннаслужачых» накіраваны на рэгуляванне пытанняў назначэння пенсій тым, хто быў звольнены з ваеннай службы ў сувязі са скарачэннем колькасці Узброеных Сіл у 1992—1994 гадах. Тады пенсія была назначана ў няпоўным памеры. Пры дасягненні агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, улічваючы невысокі памер атрымліваемай «ваеннай» пенсіі, большасць са згаданых грамадзян разлічвалі перайсці на працоўную пенсію па ўзросце. Але ў сувязі з істотнымі змяненнямі ў пенсійным заканадаўстве ўзнік шэраг складанасцей. Прэзідэнт пагадзіўся з тым, што павінна быць асобнае рашэнне па гэтым пытанні, якое датычыцца такой катэгорыі грамадзян.

У час даклада таксама разгледжаны некаторыя пытанні вылічэння стажу дзяржаўнай службы. Прэзідэнт падтрымаў прапанову аб тым, каб выключыць з кампетэнцыі Мінфіна паўнамоцтвы па дачы растлумачэнняў па пытаннях вылічэння стажу дзяржслужбы, а пакінуць гэтыя паўнамоцтвы за Мінпрацы і сацабароны, каб не было дубліравання функцый у названых двух ведамстваў.

# ЭПІЦЭНТР РАБОТЫ ДЛЯ НАВУКОВЫХ КАДРАЎ

**Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Вышэйшай атэстацыйнай камісіі (ВАК) Генадзя Пальчыка, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ў Генадзя Пальчыка, на чым цяпер будуецца работа ВАК, як праходзіць амаладжэнне навуковых кадраў — у Акадэміі навук, сферы адукацыі і рэальным сектары эканомікі. «Мы не адмаўляем ролю масцітых вучоных, але рана ці позна (жыццё так наладжана) яны сыходзяць, павінны прыйсці маладыя», — адзначыў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, мы выбралі інавацыйны шлях развіцця нашай краіны, эканомікі. «Зразумела, без навуковага суправаджэння (а навуковае суправаджэнне — гэта кадры), без адукаваных, высокакваліфікаваных, падрыхтаваных кадраў гэта немагчыма. І якраз у эпіцэнтры гэтай работы становіцца Вышэйшая атэстацыйная камісія», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка таксама ўзняў пытанне аб тым, што сёння можна зрабіць у Беларусі, улічваючы пажаданні навуковых супрацоўнікаў і магчымасці дзяржавы, каб вучоны чалавек меў адпаведнае палажэнне і статус.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

Люцына Ігнатовіч збірае чарніцы ў Аўгустоўскай пушчы.

# ЯГАДА З ВЫГАДАЙ

**Ураджай чарніц у Гродзенскай вобласці ўжо перавысіў леташні амаль у два разы — ад жыхароў рэгіёна нарыхтавана больш за 420 тон ягад. Прадукцыю ад насельніцтва прымаюць нарыхтоўшчыкі Гродзенскага абласнога спажывецкага таварыства ва ўсіх раёнах вобласці ў больш чым 1000 крамах, таксама створаны пункты прыёму.**



Прадукцыю ад насельніцтва прымаюць нарыхтоўшчыкі ў аграгарадку Сапоцкін.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый СЯНЬКО, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта:**

*«Аўтаматычны выпуск тавараў без удзелу службовай асобы мытні дазваляе скараціць час афармлення экспартных дэкларацый да 1 хвіліны з моманту прыняцця электроннага дакумента. Ужо ў чэрвені ў падобным рэжыме аформлена амаль 5 тысяч дэкларацый (удзельнічаюць у эксперыменце больш за 100 суб'ектаў гаспадарання). Для параўнання, у адным з ПМА Мінскай рэгіянальнай мытні такую колькасць дэкларацый аформілі б 12 супрацоўнікаў (колькасць чалавек у змене) толькі за тыдзень».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9916 | ▲ |
| Еўра | 2,2284 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0297 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0802 | ▲ |

**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:**

# «БЕЗ ЗАХАВАННЯ МІРУ І СТАБІЛЬНАСЦІ РАЗВІЦЦЁ КРАІНЫ НЕМАГЧЫМАЕ»

**«У сучасных умовах надзвычай важныя як канструктывізм у рабоце парламента, так і адэкватны адказ заканадаўцаў на ўнутраныя і знешнія пагрозы нашым нацыянальным інтарэсам», — заявіў у інтэрв'ю «Звяздзе» Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка.**

## РОЎНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ І СКЛАДНІКІ ДАВЕРУ

***— Уладзімір Паўлавіч, адна з тэм, якія цяпер знаходзяцца ў цэнтры грамадскага абмеркавання, — парламенцкія выбары. Як вы мяркуеце, хто з кандыдатаў у дэпутаты можа трапіць у новы склад парламента?***

— Той, каго выбаршчыкі добра ведаюць як прафесіянала і аўтарытэтную асобу па рэальных справах у выбарчай акрузе і па прымальнай для іх палітычнай пазіцыі, хто выклікае давер і належным чынам падрыхтаваўся да выбарнай кампаніі.

***— Аналітыкі на некаторых інтэрнэт-сайтах гадаюць: ці пусцяць у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў вылучэнцаў ад апазіцыйных партый?***

— Што значыць «пусцяць»? Каму быць дэпутатам, вызначаюць выбаршчыкі, і толькі яны даюць такую санкцыю. Калі нехта лічыць сваю апазіцыйнасць заслугай, вартай аўтаматычнага залічэння ў склад дэпутатаў парламента, то ён памыляецца. Ва ўсіх кандыдатаў у дэпутаты роўныя магчымасці для ўдзелу ў перадвыбарнай кампаніі. Я не сумняваюся, што выбары пройдуць



дэмакратычна, свабодна, у адпаведнасці з нашым нацыянальным заканадаўствам, як і належыць.

***— Па звестках Цэнтрвыбаркама, чакаецца канкурэнцыя саіскальнікаў дэпутацкага мандата.***

— У выбаршчыкаў будзе магчымасць параўнаць праграмы кандытатаў у дэпутаты, зрабіць свой вывад пра іх здольнасць займацца заканадаўчай дзейнасцю і аказваць выбарчай акрузе рэальную дапамогу ў вырашэнні існуючых праблем.

***— Што вы маеце на ўвазе пад здольнасцю да заканадаўчай дзейнасці?***

— Калі гаварыць коратка — высокую кампетэнтнасць, жыццёвы вопыт, веданне задач і прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі, уменне праецыраваць іх на канкрэтныя сітуацыі і прапаноўваць карысныя ідэі, зыходзячы з ведання паўсядзённых клопатаў і турбот простых людзей. А яшчэ — пастаяннае ўзаемадзеянне з мясцовай уладай. Усё гэта з'яўляецца асновай для творчай, глыбока прафесіянальнай работы ў парламенце.

СТАР. 2

■ Дэмаграфія

# Сучасная тэхніка, прафесіяналізм і чалавечы фактар

## За апошняе дзесяцігоддзе ў Гродзенскім перынатальным цэнтры адбыліся глабальныя змены

**Гродзенскі абласны клінічны перынатальны цэнтр быў адным з першапраходцаў ажыццяўлення дзяржаўнай праграмы маштабнай рэканструкцыі рададапаможных устаноў з пераасначэннем сучаснай медыцынскай тэхнікай. Прычым, многае ўкаранялася ўпершыню і потым станавілася прыкладам для калег, прычым, не толькі ў Беларусі.**



— Літаральна сёння нашы спецыялісты вяртаюцца з Казахстана, дзе па просьбе калег былі з тыднёвым навучальным курсам, — паведаміла карэспандэнту «Звязды» **намеснік галоўнага ўрача Гродзенскага абласнога клінічнага перынатальнага цэнтра па медыцынскай частцы Людміла КЕДА.**

Сучасны перынатальны цэнтр еўрапейскага ўзроўню трымаецца на чатырох кітах: дзяржаўная палітыка, аснашчэнне, кадры і ідэалогія.

СТАР. 6

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Швейцарыя афіцыйна абвясціла аб адкліканні заяўкі на ўступленне ў ЕС

Улады Швейцарыі афіцыйна апавясцілі Брусель аб адкліканні заяўкі на ўступленне ў Еўрасаюз, перадаюць інфармагенцтвы. Пра тое, што швейцарскае кіраўніцтва адклікае дакумент, паведаміў начальнік Федэральнага дэпартамента замежных спраў Дзідзье Буркхальтэр. Ён растлумачыў, што за гэты крок раней прагаласаваў парламент краіны: вялікая палата выказалася за адкліканне ў сакавіку, а малая палата падтрымала рашэнне 15 чэрвеня. Пры гэтым Дзідзье Буркхальтэр удакладніў, што ўсе партнёрскія адносіны з Еўрасаюзам захаваюцца.

### ЗША выпусцяць мадэрнізаваную атамную бомбу



ЗША плануюць у 2020 годзе выпусціць мадэрнізаваную атамную бомбу B61-12. Чакаецца, што ў новай мадыфікацыі зброя праслужыць яшчэ як мінімум 20 гадоў. Кіраўніцтва праекта па мадэрнізацыі называе стварэнне B61-12 «жыццёва важнай місіяй нацыянальнай бяспекі». Міністр энергетыкі ЗША Эрнэст Маніс заявіў, што праграма падаўжэння тэрміну эксплуатацыі дазволіць «падтрымліваць бяспечны, надзейны і эфектыўны патэнцыял ядзернага стрымлівання, памяншаючы пры гэтым памер запасаў».

### Няўдалы путч каштаваў Турцыі 100 мільярдаў долараў

Няўдалы ваенны пераварот абышоўся эканоміцы Турцыі ў 100 мільярдаў долараў, заявіў міністр мытні і гандлю Бюлент Цюфекчы. Выступаючы на прэс-канферэнцыі ў Анкары, Цюфекчы заявіў: «Улічваючы кошт усіх самалётаў, верталётаў, зброі, выбуховых рэчываў і пабудоў (знішчаных або пацярпелых падчас путчу), мінімальная сума, пра якую можа ісці гаворка, па нашых папярэдніх падліках, — 300 мільярдаў лір». Паводле слоў міністра, пры больш дэталёвым разглядзе сума, хутчэй за ўсё, павялічыцца. «Акрамя таго, нам гэта дорага абыдзецца ў сярэднетэрміновай перспектыве. Напрыклад, многія заказы з-за мяжы адменены, іншаземцы перарывалі свае паездкі ў Турцыю. З-за змоўшчыкаў у нас, на жаль, склаўся імідж краіны трэцяга свету. Людзі, якія бачаць танкі на вуліцах і парламент пад бомбамі, не паедуць у Турцыю», — канстатаваў Цюфекчы.

ISSN 1990 - 763X

16147

9 771990 763008

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Даследчыкі падрыхтаваліся да выпрабаванняў па амаладжэнні людзей



Спецыялісты з фірмы Ambrosia ў Мантэрэі (ЗША) рыхтуюцца да правядзення першых выпрабаванняў па амаладжэнні людзей з дапамогай плазмы крыві. Метад заснаваны на выніках даследавання парабіёзу на мышах, у якім крывяносныя сістэмы старых і маладых жывёл аб'ядноўваліся. Пра гэта паведамляе Science. Заснавальнікам фірмы з'яўляецца ўрач Джэсі Кармазін. Ён плануе вывучаць амаладжальнае дзеянне плазмы маладых людзей, якую будуць пераліваць добраахвотнікам ва ўзросце ад 35 гадоў. Усяго ў эксперыменце будуць удзельнічаць 600 чалавек, якія заплацяць за гэта восем тысяч долараў. Узрост донараў не павінен перавышаць 25 гадоў. Кожны рэцыпіент атрымае 1,5 літра плазмы на працягу двух дзён. Перад працэдурай і праз месяц пасля яе кроў добраахвотнікаў будзе праверана на прадмет біяхімічных змен. Эксперымент, аднак, ужо падвергся крытыцы з боку некаторых спецыялістаў. Паводле іх слоў, няма клінічных доказаў таго, што выпрабаванні могуць быць паспяховымі на людзях.

## КОРАТКА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне родным і блізкім пісьменніка Фазіля Іскандэра ў сувязі з яго смерцю.**

Сёння ў Беларусі чакаюцца дажджы і навальніцы, раніцай магчымы туман. Вецер будзе заходні і паўночна-заходні з парывамі 4-9 метраў у секунду, пры навальніцах — да 14 метраў.

**Камбінаванае жыллёвае страхаванне і страхаванне ад няшчасных выпадкаў будуць даступны для заключэння анлайн у бліжэйшы час.**

Трансляцыі Алімпійскіх гульняў пройдуць у месцах адпачынку ў Мінску і іншых гарадах Беларусі.

**Футбалісткі жаночай зборнай Беларусі сталі пераможцамі міжнароднага турніру Balaton Cup, які праходзіў у Венгрыі. Беларуска Наталля Васкабовіч прызнана лепшым варатаром, а Юлія Дубень — лепшым бамбардзірам.**

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# ЛЯТАЮЧАЯ ПАГРОЗА

**Жнівень і верасень — час, калі вельмі моцна актывізуюцца джаланосныя насякомыя. Восы, шэршні, пчолы пачынаюць дурэць і чапляцца да людзей. Скончыцца гэта можа трагічна з-за імклівай алергічнай рэакцыі. Па статыстыцы, яна развіваецца ў 1-2% уджаленых людзей. Але ёсць спосабы зменшыць верагоднасць магчымай атакі ў свой адрас з боку перапончатакрылых. Якія ж? Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з прэс-сакратаром Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Віталём ДЭМБОЎСКІМ.**

### Калі гаспадар недаглядзеў...

Першая ж думка, якая ўзнікае ў людзей, у чыіх дамах пасяліліся небяспечныя суседзі, — гэта патэлефанаваць па нумары 101. Але супрацоўнікі МНС нагадваюць: на дапамогу яны прыйсці гатовы, аднак барацьба з насякомымі не заўжды ўваходзіць у іх прамыя абавязкі.

— На ліквідацыю гнязда мы неадкладна адпраўляемся тады, калі існуе прамая пагроза жыццю і здароўю людзей, — гаворыць прэс-сакратар Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Віталь Дэмбоўскі. — Напрыклад, перапончатакрылыя пасяліліся на тэрыторыі дзіцячых садоў, школ, бальніц. Або хтосьці разварушыў гняздо. Або ў кватэры ці доме знаходзяцца малыя дзеці, а бацькі не могуць трапіць дадому з-за таго, што дарогу перакрылі небяспечныя насякомыя.



Калі ж насельнікі гнязда наўпрост не пагражаюць, то трэба звяртацца ў арганізацыю, якая абслугоўвае дом. Між іншым: калі перапончатакрылыя завяліся ў месцах агульнага карыстання шматпавярховага дома, то прыбяруць іх гняздо за кошт абслугоўваючай арганізацыі.

СТАР. 6

# ЭПІЦЭНТР РАБОТЫ ДЛЯ НАВУКОВЫХ КАДРАЎ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Прэзідэнт даручыў Вышэйшай атэстацыйнай камісіі прапрацаваць пакет прапаноў па ўдасканаленні падрыхтоўкі і атэстацыі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі.

«Даручана падрыхтаваць і разгледзець у бліжэйшы час на Прэзідыуме Савета Міністраў пакет, што датычыцца сістэмы падрыхтоўкі і атэстацыі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі», — сказаў пасля сустрэчы старшыня ВАК Генадзь Пальчык.

Паводле слоў старшыні ВАК, галоўнай тэмай яго даклада Прэзідэнту стала падрыхтоўка навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў кантэксце задач, якія былі пастаўлены на V Усебеларускім народным сходзе па інавацыйным развіцці дзяржавы. «Напэўна, важнейшы складнік, калі мы гаворым аб інавацыйным блоку, выхад вучонага на вытворчасць. Таму з Прэзідэнтам абмяркоўвалася пытанне аб магчымасці захавання тых надбавак, якія атрымлівае доктар навук, кандыдат навук, працуючы ва ўсіх сферах эканомікі і ўкараняючы вынікі сваёй навуковай дзейнасці. Гэта значыць, трэба разглядаць навуковую ступень як пэўную дзяржаўную атэстацыю, кваліфікацыю вучонага незалежна, дзе ён працуе», — растлумачыў Генадзь Пальчык.

Аляксандр Лукашэнка таксама пацікавіўся, як сёння падтрымліваюць навуковую моладзь і якія крокі ў гэтым напрамку можна яшчэ зрабіць. Паводле слоў Генадзя Пальчыка, у рамках спецыяльных фондаў Прэзідэнта маладым вучоным штогод выдзяляюцца стыпендыі, паралельна ў іх ёсць магчымасць атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва жылля. «Такая сацыяльная падтрымка з'яўляецца сістэмнай і рэзультатыўнай і будзе ў далейшым развівацца», — адзначыў кіраўнік Вышэйшай атэстацыйнай камісіі.

# «БЕЗ ЗАХАВАННЯ МІРУ І СТАБІЛЬНАСЦІ РАЗВІЦЦЁ КРАІНЫ НЕМАГЧЫМАЕ»

## РЭСУРС ДЛЯ РУХУ НАПЕРАД

***— Ёсць даўняе выказванне, што заканадаўства павінна адпавядаць уласцівасцям народа. На ваш погляд, якія ўласцівасці беларусаў як нацыі з'яўляюцца галоўнымі і якім чынам яны адлюстроўваюцца ў дзейнасці Палаты прадстаўнікоў?***

— Такія ўласцівасці — вялікая працавітасць, патрыятызм і міралюбства. Гэта, я сказаў бы, п'едэстал нацыянальнага характару. Агульнавядома, што даволі працяглы час у асяроддзі апанентаў дзяржаўнай улады спадзяваліся на рэалізацыю пры правядзенні прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў знешніх сцэнарыяў, але надзеі аказаліся марнымі. Чаму? Таму што Прэзідэнт, урад, парламент і ўся ўлада прадэманстравалі здольнасць прымаць рашэнні, якія пазітыўна адбіваюцца на самаадчуванні народа, нягледзячы на існуючыя эканамічныя праблемы. У заканадаўстве ўвасабляюцца грамадскія і дзяржаўныя інтарэсы, у тым ліку эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя, міжнародныя, заснаваныя на рэальных патрэбах краіны, як сённяшніх, так і перспектыўных. Менавіта ў гэтым сутнасць законаў, прынятых Палатай прадстаўнікоў цяперашняга склікання. Прычым па ўсіх сегментах прававога поля.

***— Як вы думаеце, Уладзімір Паўлавіч, наколькі магчыма Беларусі выстаяць, утрымацца ў такім вірлівым, імкліва плынным, жорстка канкурэнтным сённяшнім свеце? Што можа зрабіць для гэтага парламент?***

— У нашай краіны ёсць інтэлектуальны, вытворчы, грамадскі і палітычны, ды і духоўны рэсурс, для пераадолення ўсіх сённяшніх цяжкасцяў і далейшага руху наперад. Як неаднаразова адзначаў Прэзідэнт, мы павінны не толькі выстаяць, а сканцэнтравацца на пытаннях стратэгічнага значэння, канкурэнтаздольнасці эканомікі, аптымальных умоў яе эфектыўнага, устойлівага развіцця, замацавання нашага экспарту на перспектыўных рынках. Гэта перш за ўсё пытанні інавацый, новых вытворчых тэхналогій, інвестыцый, павышэння прадукцыйнасці працы, нарошчвання выпуску высакаякаснай, запатрабаванай у свеце прадукцыі, пра што гаварылася на пятым Усебеларускім народным сходзе. Вызначаныя ім задачы абсалютна рэальныя. Трэба толькі дзейнічаць, кожнаму на сваім рабочым месцы, бо ўсе мы, незалежна ад справы, якой займаемся, працуем на краіну, на наш дабрабыт.

Спатрэбяцца і новыя заканадаўчыя рашэнні. Таму вельмі важна, каб будучы парламент быў здольны панесці сваю ношу з усёй адказнасцю і разуменнем сваёй кансалідуючай ролі ў грамадстве. Кажу гэта не толькі па пасадзе і парламенцкім вопыце, але і як грамадзянін Беларусі, зыходзячы з вядомых усім нам сучасных пагроз нацыянальнай бяспецы. Калі не зберажом мір і стабільнасць у краіне, то яе развіццё стане проста немагчымым. Нестабільнасць зробіць краіну безабароннай. Вось пра што павінны думаць тыя, што лічаць сябе мэтрамі грамадзянскай самаарганізацыі.

## АСНОВА АБ'ЕКТЫЎНАЙ СЕЛЕКЦЫІ

***— Законы праваахоўнай тэматыкі і па пытаннях бяспекі, якія прымаюцца парламентам, вашы апаненты найчасцей падвяргаюць крытыцы. Як вы гэта патлумачыце?***

— Няма, бадай, ніводнага рэзананснага закона, які б падабаўся ўсім. Гэта нармальна. Мы паважаем разнастайнасць думак і меркаванняў і па названай тэматыцы, бяром іх пад увагу. Аднак лічым сваім абавязкам ствараць юрыдычны механізм, які ўмацоўвае абараназдольнасць краіны, дапамагае змагацца са злачыннасцю ва ўсіх яе праявах, папярэджваць проціпраўныя дзеянні, гарантаваць бяспеку грамадзян і грамадскі парадак. Хто, як не дзяржава, павінна гэта зрабіць? Аслабленне ў пытаннях нацыянальнай бяспекі ні да чаго добрага не прыводзіць і становіцца крыніцай разрастання канфліктаў. Паглядзіце на падзеі ў блізкім нам замежжы і некаторых краінах Еўропы.

***— Што ж важней — бяспека ці дэмакратыя?***

— Вышэйшыя каштоўнасці — бяспечнае жыццё чалавека і, падкрэсліваю, правы народа на дастойнае жыццё. З гэтага пачынаецца і ствараецца сапраўды моцная, дэмакратычная дзяржава. Гэта дзяржава, якая не аддзелена ад людзей, дзе ўлада поўнасцю валодае сітуацыяй у грамадстве, а ў сваёй унутранай і знешняй палітыцы і ў законах рэалізуе тое, што адпавядае грамадскаму запыту і задачам развіцця краіны. Такую дзяржаву Беларусь і будуе. У мяне няма сумненняў у тым, што менавіта таму на ўсіх выбарах наш народ аб'ектыўна і дакладна праводзіць палітычную селекцыю.

***— Вашы пажаданні новаму складу парламента?***

— Канструктыўнай, плённай працы. Наказы выбаршчыкаў трансфармаваць у канкрэтныя дэпутацкія справы і ў законапраекты. Заўсёды памятаць, з чаго складаюцца адказнасць парламентарыя, спакой, парадак і стабільнасць у краіне.

**Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

■ Ва ўрадзе

# КУРС НА ЗБАЛАНСАВАНУЮ ЭКАНОМІКУ

## Праз кансерватыўны падыход пры фарміраванні бюджэту

**Паводле слоў прэм'ер-міністра Андрэя Кабякова, налета краіна павінна мець збалансаваную эканоміку, якая дазволіць рэалізоўваць прыярытэты развіцця на гэтую пяцігодку, замацаваныя ў асноўных палажэннях праграмы, што была адобрана на пятым Усебеларускім народным сходзе. Акрамя таго, падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў «Аб праектах прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2017 год і параметра асноўных паказчыкаў на 2018—2019 гады, асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі і рэспубліканскага бюджэту на 2017 год» ён паведаміў, што ўсе інструменты эканамічнай палітыкі павінны быць настроены на збалансаванасць плацежнага балансу і бюджэту, зніжэнне інфляцыі.**

### Выдаткі на шэраг паслуг аптымізуюць

Так, знешнія абавязацельствы краіны павінны быць гарантавана выкананы без зніжэння золатавалютных рэзерваў. Таксама неабходна павысіць канкурэнтаздольнасць эканомікі, перш за ўсё экспарту. Гэта плануецца забяспечыць за кошт зніжэння выдаткаў і павышэння якасці прадукцыі. На думку Андрэя Кабякова, важнай задачай таксама з'яўляецца зніжэнне залежнасці беларускай эканомікі ад знешняй кан'юнктуры і сыравінных рынкаў і атрыманне максімальнай аддачы ад базавай эканомікі і дзяржсектара. «Акрамя таго, павінны быць рэалізаваны меры па стварэнні ўмоў для станаўлення новай эканомікі. Пад гэтым разумеецца стварэнне новых прадпрыемстваў у прыватным і дзяржаўным сектарах, асваенне інавацыйных тэхналогій і выпуск новай прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю, уцягванне ў гэты працэс прыватнага і замежнага капіталу. На базе такой эканомікі да канца гэтай пяцігодкі плануецца мець да 75% усяго прыросту ВУП», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Паводле яго слоў, для забеспячэння збалансаванага развіцця ў краіне павінны сур'ёзна займацца тарыфнай палітыкай і зніжэннем выдаткаў на паслугі ЖКГ, транспарту.

«У адпаведнасці з асноўнымі палажэннямі праграмы на пяцігодку да канца 2018 года мы павінны выйсці на поўнае пакрыццё такіх выдаткаў насельніцтвам. Але для гэтага энергетыкі і прадстаўнікі сферы ЖКГ павінны гарантавана скараціць выдаткі на аказанне паслуг згодна з разлікамі», — растлумачыў Андрэй Кабякоў.

Паралельна з 1 кастрычніка сёлета павінна запрацаваць напоўніцу сістэма безнаяўных жыллёвых субсідый. Для гэтага неабходна ўкараніць аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму разлікаў за жыллёва-камунальныя і іншыя паслугі.

### Стратэгічныя паказчыкі на 2017 год

У прапанаваным праекце ўказа «Аб задачах сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2017 год» захавана сістэма ключавых паказчыкаў эфектыўнасці работы ўрада і Нацыянальнага банка. Найважнейшымі паказчыкамі вызначаны: валавы ўнутраны прадукт — 101,5%; рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва — 101,2%; прадукцыйнасць працы па валавым унутраным прадукце — 101,6%; экспарт тавараў і паслуг — 103,6%; сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі — плюс 0,2% да ВУП, або крыху больш за 100 млн долараў; прамыя замежныя інвестыцыі на чыстай аснове (без уліку запазычанасці інвестару за тавары, работы, паслугі) — 1,4 млрд долараў. Застаецца задача па выхадзе на адназначныя параметры інфляцыі — 9%.

Таксама ў распрацаваным пакеце дакументаў мяркуецца захаваць сістэму фарміравання задач і ключавых паказчыкаў эфектыўнасці для міністэрстваў і прадпрыемстваў. Асноўны акцэнт пры гэтым робіцца на якасны паказчык і экспарт.

Важнейшыя паказчыкі прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця разлічаны як мэтавыя пры прагназуемым кошце нафты 45 долараў за барэль, росце эканомікі нашага асноўнага гандлёвага партнёра — Расіі — на ўзроўні 101% да 2016 года і пры курсе 70 расійскіх рублёў за долар. У сваю чаргу бюджэт краіны разлічваецца зыходзячы з кансерватыўнага падыходу, пры сярэднегадавым кошце нафты ў 35 долараў за барэль, пры прагнозе далейшага зніжэння расійскай эканомікі да 99% да ўзроўню сёлета і пры курсе 75 расійскіх рублёў за адзін долар.

Плануецца аптымізаваць выдаткі бюджэту, пры гэтым дзяржава не павінна нарошчваць знешні доўг. Такія выдаткі ў бюджэтнай сферы, як капітальнае будаўніцтва, мадэрнізацыя, капрамонт і добраўпарадкаванне тэрыторый, прыйдзецца максімальна абмежаваць. Таксама Андрэй Кабякоў адзначыў, што неабходна мець рэсурсы для падтрымання рэальнага сектара эканомікі, асабліва для стымулявання экспарту.

«У праекце бюджэту на гэтыя мэты з улікам інфляцыі павінны быць прадугледжаны рэсурсы, не ніжэйшыя за ўзровень сёлета. Бюджэт павінен захаваць сваю сацыяльную накіраванасць. Усе выдаткі па сацыяльных выплатах павінны быць забяспечаны ў поўным аб'ёме», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

### Падатковая палітыка застанецца без змен

Паводле слоў Андрэя Кабякова, падатковую палітыку налета мяняць не будуць. Прапануецца яе сфарміраваць згодна з дзеючай структурай, складам і колькасцю падаткаў. Падатковую базу плануецца пашырыць толькі за кошт росту эканомікі, стварэння новых прадпрыемстваў.

«У якасці новаўвядзення будзе ажыццяўляцца пераход з наступнага года на вылічэнне і выплату падаткаў, збораў, пошлін з долараў на беларускія рублі, у тым ліку пры вызначэнні падатковай базы на падлік зямельнага падатку. Гэта чарговы рэальны крок па дэдаларызацыі эканомікі. Многае з гэтага накірунку ўжо зроблена — у краіне адмовіліся ад долараў па большасці разлікаў», — рэзюмаваў прэм'ер-міністр.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Выбары-2016

# Каля 300 назіральнікаў ад СНД прыедуць на выбары

**Выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь перайшлі на новы этап. Да 11 жніўня будуць вызначаны кандыдаты ў дэпутаты — і пачнецца агітацыйная кампанія. Якасць падрыхтоўкі да яе ацаніў кіраўнік штаба місіі назіральнікаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў Яўген СЛАБАДА.**



— Штаб місіі прыступіў да работы 1 ліпеня, — расказвае Яўген Аляксандравіч. — Мы паглядзелі, як фарміраваліся акруговыя выбарчыя камісіі. У прыватнасці, у Мінскай вобласці. Пасяджэнне праходзіла больш за чатыры з паловай гадзіны. Таксама мы наведалі 7 раёнаў сталіцы і 11 раёнаў Беларусі, дзе ўтвараліся ўчастковыя выбарчыя камісіі. Часам пасяджэнні праходзілі па 7—8 гадзін. Напрыклад, у Першамайскім і ў Фрунзенскім раёнах Мінска. Сама кампанія ідзе спакойна, у працоўным рэжыме. Тут вялікая заслуга Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах. Падрыхтаваныя ўсе неабходныя метадычныя матэрыялы для ўчастковых выбарчых камісій, практычныя дапаможнікі для абласных, Мінскай гарадской, тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій. Выпушчана брашура, дзе сканцэнтраваны ўсе пастановы Цэнтральнай камісіі, тлумачыцца парадак работы замежных міжнародных назіральнікаў, пэўныя працэдуры. Пададзены ўзоры бланкаў выбарчай дакументацыі, якая будзе неабходная ў рабоце. З 9 чэрвеня, і гэта пазітыўна, быў адкрыты электронны рэсурс «Выбары 2016», а на сайтах гарвыканкамаў з'явіліся спасылкі на інфармацыйныя матэрыялы.

Акрамя гэтага, назіральнікі місіі СНД паўдзельнічалі ў пасяджэнні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў і Назіральнага савета па кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарнай агітацыі ў сродках масавай інфармацыі. Цяпер прадстаўнікі Садружнасці працягваюць вывучаць работу акруговых выбарчых камісій.

— На сёння мы наведалі больш за 20 акруговых выбарчых камісій і адзначаем, што работа вядзецца ў адпаведнасці з каляндарным планам, які зацвердзіла Цэнтральная камісія. Нам, назіральнікам ад Садружнасці, прадастаўляюцца ўсе неабходныя матэрыялы, якія датычацца выбарчага працэсу. Камісія працуе досыць адкрыта. Склад апублікаваны ў мясцовым друку (раённыя і гарадскія друкаваныя СМІ), вісяць графікі работы і дзяжурства. Звяртацца можна нават у суботу. Калі выбаршчык прыходзіць, яму даюць тлумачэнне таго ці іншага пытання. Мы накіравалі лісты ў дзяржаўныя структуры, у кампетэнцыю якіх уваходзіць разгляд скаргаў і заяў грамадзян, звязаных з выбарчай кампаніяй, з просьбай прадастаўляць інфармацыю аб разглядзе такіх скаргаў і заяў, а таксама дамовіліся аб правядзенні сустрэч з кіраўніцтвам гэтых структур. І станоўчы момант: паводле інфармацыі Цэнтральнай камісіі, у сярэднім па краіне атрымліваецца каля 4 чалавек на 1 дэпутацкае месца.

У назіральнікаў місіі СНД насычаная праграма. На 10 жніўня запланавана сустрэча ў Вярхоўным судзе. Наперадзе — працоўныя сустрэчы з перадвыбарнымі штабамі кандыдатаў і з палітычнымі партыямі.

Этап ініцыятыўных груп, які ўжо скончыўся, прайшоў спакойна. Людзі дастаткова актыўна падыходзілі да пікетаў, цікавіліся інфармацыяй. На сёння ў складзе місіі акрэдытавана 165 чалавек. Мы мяркуем, што іх будзе каля 300. У Беларусі 110 выбарчых акруг. У дзень галасавання нашы назіральнікі наведаюць усе. А доўгатэрміновыя назіральнікі праверацць работу прыкладна 70—80% выбарчых акруг яшчэ і да 11 верасня. У хуткім часе мы плануем выезд у вобласці і раёны, наведаем акруговыя камісіі: будзем сачыць за рэгістрацыяй кандыдатаў у дэпутаты.

**Надзея АНІСОВІЧ**

■ Геапалітыка

# БІТВЫ НА ЗЯМЛІ І Ў КІБЕРПРАСТОРЫ



У самым канцы тыдня нарэшце **вырашылася сітуацыя** з захопам будынка палка патрульна-паставой службы **ў Ерэване**. Нягледзячы на тое, што ўсе закладнікі былі адпушчаны яшчэ на мінулым тыдні, тыя, хто нападаў, 27 ліпеня ўмудрыліся захапіць новых — медыкаў, якіх прапусцілі ў будынак аказаць ім дапамогу. У рэшце рэшт і гэтых закладнікаў удалося вызваліць. 29 ліпеня апазіцыя правяла пратэсны мітынг у падтрымку ўдзельнікаў захопу, які быў спынены сіламі правапарадку, 165 дэманстрантаў было затрымана. Падчас перастрэлкі з паліцыяй 30 ліпеня загінуў супрацоўнік паліцыі Ерэвана. 31 ліпеня спецназ паспяхова правёў штурм будынка, падчас якога затрымаў 20 удзельнікаў захопу, частка з якіх была паранена. Але сам захоп будынка яшчэ доўга будзе аказваць уплыў на палітычную сітуацыю ў краіне, палітычная атмасфера ў якой і да гэтага не вызначалася стабільнасцю.

**Тэрарыстычныя акты** працягнулі дэстабілізаваць сітуацыю **ў Еўрасаюзе**. 26 ліпеня два тэрарысты ўварваліся ў царкву гарадка Сент-Эцьен-дзю-Руўрэ, які размешчаны на поўначы Францыі, і захапілі ў закладнікі святара, манашак і вернікаў. Скончылася ўсё тым, што 84-гадоваму святару перарэзалі горла, а самі тэрарысты былі забіты спецназам. Пры гэтым высветлілася, што адзін з тых, хто нападаў, знаходзіўся пад наглядам паліцыі за дзве няўдалыя спробы дабрацца да Сірыі і паўдзельнічаць у джыхадзе на баку групоўкі «Ісламская дзяржава». Рэакцыя на ліпеньскую хвалю тэрарыстычных актаў у ЕС назіраецца самая разнастайная. Так, прэзідэнт Чэхіі Мілаш Земан заклікаў задумацца аб пашырэнні магчымасцяў для грамадзян валодаць зброяй, насіць яе і пры неабходнасці выкарыстоўваць для абароны ад тэрарыстаў. У Францыі аб'явілі аб стварэнні Нацыянальнай гвардыі з рэзервістаў, каб рэзка павялічыць колькасць узброеных людзей у форме, з дапамогай якіх можна спыняць дзейнасць тэрарыстаў. Зрэшты, увасабленне ідэі ў жыццё можа зацягнуцца на некалькі месяцаў. Частка буйных французскіх СМІ аб'явіла аб рашэнні перастаць публікаваць імёны і фотаздымкі тэрарыстаў, каб не папулярызаваць іх дзеянні. Таксама прэм'ер-міністр Францыі Мануэль Вальс выказаўся ў падтрымку забароны фінансавання мячэцяў на тэрыторыі краіны з-за мяжы, каб пазбегнуць радыкалізацыі мусульман, якія пражываюць у краіне. Намеснік старшыні буйнога палітычнага аб'яднання Даніі — Дацкай народнай партыі — Серэн Эсперсен пайшоў яшчэ далей, выступіўшы з ідэяй татальнай забароны мусульманам уезду ў краіну. На яго думку, таксама варта пазбаўляць дацкага грамадзянства прапаведнікаў-мусульман, якія заклікаюць да экстрэмізму. Канцлер Германіі Ангела Меркель паведаміла пра сур'ёзнае ўзмацненне службаў бяспекі праз вялікі набор новых супрацоўнікаў.




У **амерыканскай выбарчай кампаніі** падзеі развіваюцца па графіку. Услед за Дональдам Трампам, які стаў афіцыйным кандыдатам ад рэспубліканскай партыі 20 ліпеня, Хілары Клінтан стала афіцыйным кандыдатам ад дэмакратычнай партыі 27 ліпеня. Два скандалы ахарактарызавалі выбарчую кампанію на тыдні. Першы быў звязаны з узломам сайта Нацыянальнага камітэта дэмакратычнай партыі Злучаных Штатаў Амерыкі, пасля якога партал Wikileaks апублікаваў амаль 20 тысяч электронных лістоў. З апошніх, у прыватнасці, вынікала, што кіраўніцтва дэмакратычнай партыі з самага пачатку дыскрымінавала Берні Сандэрса на карысць Хілары Клінтан. Другі скандал выбухнуў у сувязі з выказаным Дональдам Трампам меркаваннем, што сумесная барацьба з «Ісламскай дзяржавай» разам з Расіяй важней для ЗША, чым выкарыстанне санкцый супраць Расіі пасля ўваходжання Крыма ў яе склад. Гэта дазволіць ЗША сэканоміць шмат грошай і шмат жыццяў амерыканцаў. Натуральна, што Хілары Клінтан тут жа абвінаваціла Дональда Трампа ў падтрымцы Уладзіміра Пуціна. Варта адзначыць, што па выніках апублікаванага на мінулым тыдні даследавання грамадскай думкі Reuters і Ipsos рэйтынг Трампа склаў 34,6% супраць 40,5% у Клінтан.

На мінулым тыдні **ад кібершпіянажу пацярпелі** не толькі высокапастаўленыя члены дэмакратычнай партыі ЗША, але і **расійскія камп'ютарныя сеткі 20 органаў дзяржаўнай улады, абаронных прадпрыемстваў і навуковых устаноў**. 30 ліпеня ФСБ паведаміла пра гэта, выказаўшы думку, што гэта вынік добра арганізаванай і загадзя спланаванай атакі. У якасці асноўных падазраваных у кібершпіянажы эксперты лічаць хакераў з ЗША ці Кітая.

У барацьбе з «Ісламскай дзяржавай» з'явіліся абнадзейлівыя навіны. Сірыйская армія пры падтрымцы расійскай авіяцыі распачала чарговую спробу **вярнуць** сабе **Алепа** — адзін з найбуйнейшых гарадоў Сірыі. Між тым іракская армія працягвае наступленне на Масул, які лічыцца сталіцай «Ісламскай дзяржавы». Міністр абароны Ірака Халед аль-Абейдзі паведаміў у інтэрв'ю пра тое, што многія камандзіры «Ісламскай дзяржавы» ўцякаюць з Масула.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62

**Продавец:** ОАО «Плисский льнозавод», Витебская обл., Глубокский р-н, г.п. Подсвилье, ул. Советская, 83, (029) 598-99-44.

Наименование предмета торгов. Начальная цена (с учетом/до деноминации)

Лот №1. Капитальное строение с инв. №220/С-26912 по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Подсвильский с/с, г.п. Подсвилье, ул. Советская, д. 83, площадью 12,6 кв.м, на зем.участке с кадастровым №221585090610000024, площадью 0,0371 га, наименование – Насосная станция 1-го подъема, в т.ч. линия электропередачи 0,4 кВ, на зем. участках с кадастровыми №: 221585090610000026, 221585090610000027, 221585090610000028, 221585090610000029, 221585090610000030, 221585090610000031, 221585090610000032. Нач. цена: 891/8 910 000 руб. без НДС

Лот №2. Льнокомбайн ЛКВ-4А, инв. №198, 2005 г.в. Нач. цена: 288/2 880 000 руб. без НДС

Лот №3. Льнокомбайн ЛКВ-4А, инв. № 400, 2002 г.в. Нач. цена: 288/2 880 000 руб. без НДС

Лот №4. Комбайн льноуборочный самоходный КЛС-3,5 «ПАЛЕССЕ LS-35», 2009 г.в., заводской №085, инв. №231. Нач. цена: 24 750/247 500 000 руб. без НДС

Лот №5. Автомобиль грузопассажирский вагон УАЗ-39099-4, рег. знак АВ 5987-2, 2008 г.в. Нач. цена: 3 618/36 180 000 руб. без НДС

Лот №6. Агрегат почвообрабатывающий посевной АПП-6А-01, инв. номер 526, 2009 г.в. Нач. цена: 37 595,25/375 952 500 руб. без НДС

Лот №7. Производственная база ОАО «Плисский льнозавод» по адресу: Витебская обл., Ушачский р-н, г.п. Ушачи, ул. Калининская, д.118, в т.ч. капитальные строения: Производственный корпус, инв. №234/С-8549 площадью 1821 кв.м; Весовая, инв. №234/С-8559 (д. 118/4) площадью 243 кв.м; Столярная мастерская, инв. №234/С-8551 (д. 118/8), площадью 18 кв.м; Насосная, инв. №234/С-8553 (д. 118/5) площадью 6 кв.м; Гараж-насосная инв. №234/С-8552 (д. 118/11) площадью 157 кв.м; Склад льносемян, инв. №234/С-8560 (д. 118/9) площадью 411 кв.м; Склад готовой продукции, инв. №234/С-8556 (д. 118/1) площадью 631 кв.м; Электроподстанция, инв. №234/С-8550 (д. 118/10) площадью 23 кв.м; Склад ГСМ, инв. №234/С-8555 (д. 118/3) площадью 32 кв.м; Навес для льна №3, инв. №234/С-8616 (д. 118/6) площадью 1298,6 кв.м; Навес для льна №4, инв. №234/С-8617 (д. 118/7) площадью 173,5 кв.м; Кабельные линии электропередач, инв. №234/С-8649 (д.118) протяженностью 184,4 м; Линия электропередач, инв. №234/С-8648 (д.118) протяженностью 377,3 м; Проходная, инв. №234/С-8554 (д.118/2) площадью 22,9 кв.м, в т.ч.: пешеходная часть, ограждение; оборудование. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым №224955100001000185 площадью 20,6811 га. Нач. цена: 181 089,45/1 810 894 493 руб. без НДС

Лот №8. Производственная база ОАО «Плисский льнозавод» по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Подсвильский с/с, г.п. Подсвилье, ул. Советская, д. 83, в т.ч. капитальные строения: административно-бытовой корпус, инв. №220/С-5652 площадью 2416,3 кв.м; производственный корпус, инв. №220/С-26836 (д. 83, корп. 1) площадью 11309,6 кв.м, в т.ч: кабель 0,4 кВ, кабель 10 кВ; Заправочная инв. №220/С-26857 (д. 83, корп. 11) площадью 487,7 кв.м; блок вспомогательных помещений, инв. №220/С-26839 (д. 83, корп. 12) площадью 518,4 кв.м, в т.ч.: кабель 0,4 кВ, кабель 10 кВ; Материальный склад, инв. №220/С-15281 (д. 83/9) площадью 604,3 кв.м; Электроцех, инв. №220/С-15299 (д. 83/10) площадью 97,8 кв.м; Здание автовесовой №1, инв. №220/С-15286 (д. 83/3) площадью 50,9 кв.м; Автовесовая № 2, инв. №220/С-15297 (д. 83/4) площадью 50,9 кв.м; Костросборник, инв. №220/С-15292 (д. 83/6) площадью 92,3 кв.м; Здание фильткамеры, инв. №220/С-26840 (д. 83, корп. 2) площадью 946,0 кв.м; Конюшня, инв. №220/С-26841 (д. 83, корп. 13) площадью 124,9 кв.м; Проходная старого завода, инв. №220/С-26830 (д. 83, корп. 14) площадью 8,9 кв.м; Мазутонасосная, инв. №220/С-15284 (д. 83/5) площадью 66,4 кв.м; Шоха №1, инв. №220/С-26803 площадью 3434,4 кв.м; Шоха №2, инв. №220/С-26802 площадью 3434,4 кв.м; Шоха №3, инв. №220/С-26804 площадью 3436,8 кв.м; Шоха №4, инв. №220/С-26805 площадью 3427,2 кв.м; Шоха №5, инв. №220/С-26806 площадью 3434,4 кв.м; Шоха №6, инв. №220/С-26801 площадью 3432,0 кв.м; Шоха №7, инв. №220/С-26807 площадью 3146,4 кв.м; Водонапорная башня, инв. №220/С-26800 площадью 11,3 кв.м; Резервуар для мазута с помещением коренных задвижек №1, инв. №220/С-26861; Резервуар для мазута с помещением коренных задвижек № 2, инв. №220/С-26862; Насосная станция 2-го подъема, в т.ч. водопровод, противопожарные резервуары 2 шт., инв. №220/С-26825 площадью 104,2 кв.м; Трансформаторная подстанция, инв. №220/С-15295 (д. 83/8) площадью 21,0 кв.м; Техническая насосная станция, инв. №220/С-26826 площадью 224,2 кв.м; Сети наружного освещения, инв. №220/С-26827; Эстакада технологических трубопроводов, инв. №220/С-26863; Канализационная сеть, инв. №220/С-26828; Водопроводные сети, инв. №220/С-26822; Мазутопровод, инв. №220/С-26824; Трасса мазутопровода, инв. №220/С-26823; Теплотрасса, инв. №220/С-26838; Канализационная напорная сеть, инв. №220/С-26837; Канализационно-насосная станция, инв. №220/С-26799 площадью – 47,1 кв.м; Оборудование; Строительные материалы. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым №221555400001000019. Нач. цена: 1 825 450,94/18 254 509 378 руб. без НДС

Лот №9. Капитальное строение с инв. №220/С-15300 (Гараж для автомашин) по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, Подсвильский с/с, г.п. Подсвилье, ул. Советская, д. 83, корп. 7, площадью 1060,7 кв.м, на зем. участке с кадастровым №221585090610000023 площадью 0,2819 га. Нач. цена: 30 733/307 730 000 руб. без НДС

Лот №10. Автомобиль грузовая специальная пожарная машина ГАЗ-53А, рег. знак 5690 ВТН, 1979 г.в. Нач. цена: 180/1 800 000 руб. без НДС

Лот №11. Автомобиль грузопассажирский вагон ГАЗ 2705, рег. знак АА 2181-2, 2005 г.в. Нач. цена: 1 300 000/130 руб. без НДС. Задаток: 13/130 000 руб.

Лот №12. Прицеп бортовой тентовый МАЗ 837810 014, рег. номер А 1258 А-2, 2008 г.в. Нач. цена: 630/6 300 000 руб. без НДС

Лот №13. Токарный станок SN-402, инв. №180, 1979 г.в. Нач. цена: 320/3 200 000 руб. без НДС

Лот №14. Механическая ножовка 872m, инв. №369, 1997 г.в. Нач. цена: 136/1 360 000 руб. без НДС

Лот №15. Станок деревообрабатывающий КЛ-96, инв. №181, 1979 г.в. Нач. цена: 148/1 480 000 руб. без НДС

Лот №16. Комбайн льноуборочный КЛС-3,5, рег. знак ВВ-2 1512, 2008 г.в. Нач. цена: 2 860/28 600 000 руб. без НДС

Лот №17. Комбайн льноуборочный самоходный КЛС-3,5 Полессе LS35, рег. знак БХ 9339, 2009 г.в. Нач. цена: 3 230/32 300 000 руб. без НДС

Лот №18. Прицеп ОДАЗ 885, рег. знак 6400 ВТ, 1980 г.в. Нач. цена: 66/660 000 руб. без НДС

Лот №19. Сверлильный станок 2Н-118, инв. №10, 1966 г.в. Нач. цена: 82/820 000 руб. без НДС

Лот №20. Машина раскладочная МР-1400, инв. №533, 2010 г.в. Нач. цена: 1084,94/10 849 397 руб. без НДС

Лот №21. Машина слоеформирующая МС 6,97, инв. №534, 2010 г.в. Нач. цена: 2 712,35/27 123 492 руб. без НДС

Лот №22. Машина трясильная ТН-112-01, инв. №539, 2010 г.в. Нач. цена: 1855,68/18 556 820 руб. без НДС

Лот №23. Агрегат мяльно-трепальный МТА-2Л, инв. №538, 2010 г.в. Нач. цена: 17 588,53/175 885 308 руб. без НДС

Лот №24. Машина мяльная М-110-Л, инв. №537, 2010 г.в. Нач. цена: 2 445,39/24 453 864 руб. без НДС

Лот №25. Панель автоматизации, инв. №551, 2011 г.в. Нач. цена: 51,29/512 949 руб. без НДС

Лоты №№26-29. Сушилка СКП-10КУ, 1979 г.в. Нач. цена за 1 лот: 1457,68/14 576 799 руб. без НДС

Лоты №30-33. Трясильная машина ТГ-135, г.в. Нач. цена за 1 лот: 176,33/1 763 329 руб. без НДС

Лот №34. Пресс РП-5, инв. № 179, инв. №179, 1979 г.в. Нач. цена: 147,43/1 474 323 руб. без НДС

Лот №35. Машина СМТ-200, инв. №235, 1985 г.в. Нач. цена: 302,17/3 021 725 руб. без НДС

Лот №36. Машина МТА-1Л, инв. №256, 1988 г.в. Нач. цена: 2706,48/27 064 837 руб. без НДС

Лот №37. Кудельно-приготовительный агрегат КПЛМ-2М, инв. №167, 1979 г.в. Нач. цена: 106,32/1 063 222 руб. без НДС

Лот №38. Циклон ЦН-15, инв. №322, 1992 г.в. Нач. цена: 268,43/2 684 307 руб. без НДС

Лот №39. Пресс паковочный РП-5, инв. №50, 1972 г.в. Нач. цена: 206,75/2 067 499 руб. без НДС

Лот №40. Пресс паковочный РП, инв. №51, 1974 г.в. Нач. цена: 397,20/3 971 973 руб. без НДС

Лот №41. Пресс НВВ, инв. №57, 1990 г.в. Нач. цена: 288,56/2 885 623 руб. без НДС

Лот №42. Станок СМТ-200, инв. №59, 1991 г.в. Нач. цена: 179,13/1 791 337 руб. без НДС

Лот №43. Трепальное колесо, инв. №104,1965 г.в. Нач. цена: 156,71/1 567 135 руб. без НДС

Лот №44. Машина разрывная (гидропресс), инв. №63, 1996 г.в. Нач. цена: 197,21/1 972 123 руб. без НДС

Лот №45. Циклон, инв. №299, 1991 г.в. Нач. цена: 15,34/153 376 руб.

Лот №46. Машина сушильная СКП-10КУ, инв. №39, 1985 г.в. Нач. цена: 139,84/1 398 372 руб. без НДС

Лот №47. Станок СМТ-200М, инв. №250, 1987 г.в. Нач. цена: 161,22/1 612 203 руб. без НДС

Лот №48. Машина МТА-2Л, инв. №188, 2005 г.в. Нач. цена: 11 992,18/119 921 801 руб. без НДС

Лот №49. Самоходный оборачиватель лент льна «ОСЛ-1», инв. №512, 2009 г.в. Нач. цена: 1408,75/14 087 490 руб. без НДС

Повторные торги состоятся **26.08.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 03.08.2016 с 8.30 по 25.08.2016 до 17.30**. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5% от начальной цены лота. Задаток: 10% от начальной цены лота. Задаток перечисляется на р/с №3012470594456 в РКЦ №39 филиала ОАО «Белагропромбанк» Витебского облуправления, код 424, УНП 300019491. Получатель платежа: ОАО «Плисский льнозавод». Движимое имущество расположено по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г.п. Подсвилье, ул. Советская, 83. Условие аукциона: оплата НДС сверх цены продажи имущества. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 08.07.2016, 29.06.2016, 08.06.2016

**Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. №415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на р/с, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них), при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 (пяти) дней со для проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Имущество бывшее в употреблении. Ознакомление с объектом осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. **Конт. тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

3 жніўня 2016 г.
№ 13 (376)


БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

## ЧЫМ ЗМОЖАМ, ДАПАМОЖАМ...

***Карэспандэнт «Звязды» пацікавілася, як у Клічаўскім раёне дэпутаты рэагуюць на звароты грамадзян***

Нэлі ЗІГУЛЯ

**Некаторыя лічаць, што звяртацца са сваімі праблемамі да дэпутатаў — бессэнсоўная справа. Ну чым яны дапамогуць? Асабліва ў глыбінцы, дзе лішніх грошай у бюджэце ніколі не было. Але ж насуперак усім гэтым меркаванням работа вядзецца. І, як высветлілася, не маленькая.**

### Дарогі — гэта боль

Часцей за ўсё мясцовых жыхароў турбуюць камунальныя пытанні і стан дарог. Калі не патрабуецца вялікіх грашовых укладанняў, праблемы ліквідуюцца хутка. У іншым выпадку даводзіцца абмяжоўвацца мінімумам. Звярнуліся неяк у райсавет маладыя матулі з просьбай стварыць умовы для адпачынку з дзецьмі. Грошай на гэта, вядома, няма, але не пакідаць жа такое важнае для гараджан пытанне без увагі. Цяпер гаспадарчым спосабам добраўпарадкоўваецца спецыяльная пляцоўка ў парку адпачынку.

**Старшыня Клічаўскага райсавета Уладзімір КНІГА** паказвае будучае месца адпачынку. Тэрыторыя ўмоўна падзелена на 4 гульнявыя зоны, у кожнай сваё назначэнне.

У цэнтры будзе прыгожая вялікая клумба. Вакол яе з'явяцца лаўкі. Ужо зроблены альтанкі і дзіцячыя горкі.

За перыметрам тэрыторыі стаіць воданапорная вежа. Наконт яе наогул вялікія планы.

— Я прапанаваў зрабіць з яе скаладром, і мяне падтрымалі, — адкрывае сакрэт Уладзімір Кніга. — Праект удзельнічае ў конкурсе мясцовых ініцыятыў, спадзяёмся, што будзе рэалізоўвацца па лініі ПРААН. Хацелася б яшчэ зрабіць лыжаролерную трасу, ды пакуль на гэта не хапае грошай. Але з цягам часу тут будзе ўсё — і лыжаролерная, і траса для скейтборда, і многае іншае.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)***

**З гэтай вежы хацелася б зрабіць скаладром.**



СВОЙ СЯРОД СВАІХ

## «РАЙСКІ КУТОК» У СЛАБОДЦЫ

***Яго зрабіў сваімі рукамі мясцовы стараста***



**АМАЛЬ дзесяць гадоў красуе незвычайны кветнік у браслаўскай вёсцы Слабодка. А належыць ён старасту населенага пункта Пятру ВІТКОЎСКАМУ. Перад домам старасты нярэдка затрымліваюцца вяскоўцы, жыхары з суседніх вёсак, прыпыняюцца і турысты, якіх улетку нямала. Слабодка — разынка краю Браслаўскіх азёр, не выпадкова тут шмат вандроўнікаў. Немагчыма адвесці вачэй ад кветніка, як немагчыма не звярнуць увагі на высокі драўляны крыж, які нібыта ўладарыць над «райскім кутком». Адразу відаць, з якой стараннасцю і любоўю слабодкаўскі стараста шчыраваў над лапікам зямлі! Садова-ландшафтная кампазіцыя, якую ён стварыў, пачынаецца (альбо завяршаецца) фігурай Божай Маці на мураваным пастаменце, бо гэты неўміручы сімвал святасці нагадвае пра вечныя ісціны дабрыні і міласэрнасці.**

Адметнасць Слабодкі ў тым, што большасць яе жыхароў — каталікі. На скрыжаваннях вуліц стаяць ахоўныя крыжы. Над вёскай узвышаецца белы касцёл — архітэктурная жамчужына Паазер'я. Па ўсім відаць, што слабодкаўцы шануюць сваю веру. Няма нічога дзіўнага і ў тым, што Пётр Віткоўскі таксама з асаблівай пашанай ставіцца да яе. Ён адзін з першых вяскоўцаў вітаў вяртанне рэлігіі ў грамадства, дапамагаў святарам будаваць агароджы вакол касцёлаў, узводзіў пастаменты для хрысціянскіх сімвалаў і скульптур. Першы з вяскоўцаў, пад вокнамі свайго дома ён збудаваў невялікую сакральную пляцоўку.

— Сумна жыць без кветак, без прыгажосці, без усмешак на тварах вяскоўцаў, — кажа 77-гадовы гаспадар сядзібы, калі мы завялі размову пра сэнс яго занятку. — Праца на сваім падворку дае бадзёры настрой, натхненне, нараджае творчыя фантазіі. Хочацца рабіць нешта незвычайнае, каб радаваць сябе і іншых. Прыйшоў час, каб жыхары клапаціліся пра аблічча сваёй вёскі, імкнуліся зрабіць яе найпрыгажэйшым населеным пунктам у раёне, — без аніякага пафасу кажа пенсіянер.

Ствараючы свой кветкавы аазіс, Пётр Іосіфавіч праявіў сябе і як скульптар. У кампазіцыі кветніка вылучаецца фігура аленя. Цікава, гаспадар без аніякай падрыхтоўкі распачаў гэту творчую работу. У вольнай трактоўцы аўтара цэментны алень атрымаўся гэткім мульцяшным, з ганарыстым выглядам, што робіць скульптуру прыкметнай і цікавай для любога наведвальніка.



Замахнуўся творца і на «птушыную» тэму. Дзвюх нясушак і пеўніка са свайго падворка ўвекавечыў па просьбе жонкі. Спачатку зрабіў драцяныя каркасы, заліў іх вадкім цэментам, а калі цэмент зацвярдзеў, пачаў ювелірную работу. Гэтак было і з лебедзямі, і з чырванадзюбымі буслами.



— «Жывы куток» заўсёды выклікае асаблівы інтарэс у дзяцей і ў дарослых, планую папоўніць сваю калекцыю самым вялікім драпежнікам нашых лясоў — мядзведзем, — дзеліцца творчымі задумамі крэатыўны стараста.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**
*Браслаўскі раён.*

ПОЎНЫМ ХОДАМ

## РЭНЕСАНС У РАГАЧОВЕ

### Больш за сорак аб'ектаў гарадской інфраструктуры будзе адрамантавана, рэканструявана і добраўпарадкавана ў Рагачове да Дня беларускага пісьменства–2016

**Каб ніхто з гасцей не заблукаў, дарогу падкажуць архітэктурныя кампазіцыі на ўездах у горад з боку Быхава і Бабруйска. Ужо сёння цешаць вока адноўленыя тэрыторыі вакол чыгуначнага вакзала. Вонкавае і ўнутранае аблічча будынка змянілася. Цяпер добраўпарадкоўваецца навакольная тэрыторыя: аўтамабільная паркоўка, новы прыпыначны павільён, асфальтаваныя пешаходныя дарожкі ў прывакзальным скверы...**



Працягваюцца работы па добраўпарадкаванні паркавай зоны ў раёне пад назвай «Балота». Там робіцца дрэнажная сістэма, ідзе падсыпка грунту, высечка хмызнякоў... Парк, які будзе на гэтым месцы, стане сапраўдным упрыгажэннем горада. Як расказаў намеснік старшыні Рагачоўскага райвыканкама Руслан Смірноў, да сярэдзіны жніўня Рагачоўскі музей народнай славы набудзе кардынальна новы выгляд.

— Ужо можна ацаніць стаянку для аўтамабіляў каля будынка. Хутка будзе зроблены капітальны рамонт даху, асвежаны фасад, заменены плот. Актыўна вядзецца рамонт унутры будынка. Прынцыпова зменіцца зала археалогіі, сцены якой будуць упрыгожаны тэматычнымі малюнкамі мясцовых мастакоў. У музеі з'явяцца новыя шафы, вітрыны для экспанатаў з падсветкай, тэлевізар для трансляцыі слайд-шоу гістарычных фатаграфій і іншыя неабходныя прадметы.



Працоўныя калектывы Рагачоўшчыны актыўна падключыліся да падрыхтоўкі. Ужо праведзена шэсць суботнікаў. Супрацоўнікі райвыканкама, міліцыі, МНС і СДЮШАР-2 добра папрацавалі ў раёне вяслярнай базы, уздоўж прыбярэжнай зоны Дняпра. Яны правялі падрыхтоўчыя работы на тэрыторыі гарадскога парку. Прадстаўнікі сферы адукацыі наводзілі парадак на сваіх аб'ектах. Многія ўдзельнічалі ў афарбоўцы агароджаў, разбіўцы клумбаў і азеляненні горада. Мясцовыя жыхары наводзілі парадак вакол сваіх дамоў.

У рагачоўскім парку Піянераў плануецца арганізаваць новыя месцы адпачынку і дзіцячыя пляцоўкі, добраўпарадкаваць тэрыторыю летняга амфітэатра. Акрамя таго, будзе зроблена замена пліткі каля стэлы, якую таксама адрамантуюць. У межах падрыхтоўкі да свята таксама будзе зроблены бягучы рамонт даху і фасада раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі, заменены вокны ў цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

І школы ўпрыгожваюцца. У СШ №3 ідзе капітальны рамонт. Работы вядуцца сіламі валанцёраў — навучэнцаў будаўнічых каледжаў Рагачова, Мазыра і Гомеля. Да таго ж, тут будзе цалкам абноўлены стадыён. Дарэчы, дэмантаваныя матэрыялы плануецца выкарыстоўваць для ўладкавання іншых аб'ектаў раёна. Папрыгажэе і СШ №2. Галоўны акцэнт тут зроблены на прывядзенне ў парадак тэрыторыі. У прыватнасці, пераабсталююць стадыён, а ў будынку будзе завершаны капітальны рамонт.

Свежы выгляд набудуць і спартыўныя ўстановы. Ужо змяніўся будынак фізкультурна-спартыўнага клуба «Ураджай», дзе зроблены рамонт з заменай вокнаў. Плануецца абнавіць ганак, уваходныя дзверы і добраўпарадкаваць тэрыторыю. Рамонты будуць праведзены і ў спартыўнай зале ДЮСШ-1, у басейне СДЮШАР-2. Праходзіць «лячэнне» Рагачоўскі стадыён. Тут аднаўляюць трыбуны і памяшканні пад імі.

Зусім хутка ўстановы аховы здароўя Рагачова абновяць свой вонкавы выгляд, а новае абсталяванне палепшыць дыягностыку і лячэнне. У аддзяленні «Хуткай дапамогі» з'явяцца новыя сучасныя аўтамабілі. Розныя рамонтныя работы цяпер вядуцца ў радзільным, хірургічным, інфекцыйным і паталагаанатамічным аддзяленнях, дзіцячай бальніцы, паліклініцы і тэрапеўтычным корпусе.

Падчас падрыхтоўкі да Дня беларускага пісьменства рагачоўскія камунальнікі заменяць больш чым шэсць кіламетраў цеплясетак і абновяць водаправодную сетку. Асноўны аб'ём работ правядуць у пасёлку Космас, мікрараёне Залінейны, на вуліцах Смідовіча і Друцкай. Усяго ў Рагачове запланавана замяніць каля 15 кіламетраў труб сістэмы водазабеспячэння. Да галоўнага культурнага свята краіны абновіцца і фантан. Апроч цэнтральнай, там з'явіцца яшчэ адна водаправодная лінія, што дазволіць яму лепш струменіцца і дарыць людзям жаданую прахалоду.

Да таго ж, у Рагачове праходзяць бягучы і капітальны рамонты жылых дамоў, усталёўваюцца агароджы на вуліцах, рэканструююцца высакавольтныя лініі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

## НАВОШТА ДРЭВЫ ССЕКЛІ?

**У наш карпункт па Віцебскай вобласці звярнуліся чытачы, якіх турбавалі факты парушэння прыродаахоўнага заканадаўства. З агучанымі «экалагічнымі сігналамі» журналіст звярнуўся па афіцыйны каментарый у мясцовыя органы ўлады.**

У прыватнасці, мужчына бачыў, як у возеры Тапорына Віцебскага раёна пастух дазваляў купацца каровам. Няўжо гэта не забараняецца?

Зварот карэспандэнта быў вывучаны з выездам на месца.

— Факт знаходжання кароў, якія належаць насельніцтву, у возеры Тапорына пацверджаны. З вінаватым правялі прафілактычную гутарку. Для папярэджання ўзнікнення падобнай сітуацыі ў будучыні адміністрацыя Заронаўскага сельсавета правяла тлумачальную гутарку з насельніцтвам, — паведаміў **Пётр КАРАНКОВІЧ, першы намеснік старшыні, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Віцебскага райвыканкама.**

Акрамя гэтага, у Заронаве на інфармацыйных шчытах размясцілі аб'явы аб недапушчэнні выпасу кароў у межах берагавой лініі возера...

А яшчэ адзін заяўнік — падпісчык газеты — абураўся тым, што ў цэнтры Сянна знішчаюць дрэвы і клумбы. Чытач нагадаў, што пры ўсім гэтым сёлета ў райцэнтры плануюць правесці абласныя «Дажынкі».

У райвыканкаме растлумачылі, што зялёныя насаджэнні на вуліцах Савецкай і Карла Маркса (там месціцца і выканкам) знаходзіліся ў нездавальняючым стане. Частка дрэў пацярпела ў выніку шквалістага ветру, а гэта стварала пагрозу жыццям людзей.

— Восенню ў скверы на вуліцы Карла Маркса будуць высаджаны 60 дрэў: туя, клён, вярба, каштан, дуб, — адзначыў **намеснік старшыні Сенненскага райвыканкама па будаўніцтве Сяргей ПРАКАПОВІЧ.** Ён падзяліўся планамі і наконт стварэння будучых газонаў. Клумбы ж дэмантавалі з-за таго, што тыя страцілі эстэтычны выгляд.

Чытач таксама падзяліўся ўспамінамі наконт блакітных елак, якія калісьці раслі каля райвыканкама. Маўляў, «таксама пад корань, а навошта?»

Спецыялісты растлумачылі, што дрэвы былі перарослыя. З-за непасрэднай блізкасці да будынка разбуралі фундамент. І ў выніку іх ссеклі. Але было гэта сем гадоў таму.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

ПАРАДАК НА ВЁСЦЫ

## ЦІ ЁСЦЬ АЛЬТЭРНАТЫВА СМЕТНІКАМ?

***Як змагаюцца са стыхійнымі звалкамі ў Карэліцкім раёне***

**ПАМЯТАЮ, калі я была маленькая, за некалькі метраў ад плота на полі ў нашай вёсцы была невялікая (у некалькі каўшоў экскаватара) яма-сметнік. Калі яна напаўнялася, той жа экскаватар засыпаў смецце зямлёй і непадалёк капаў новую. Зараз так не робяць, бо ралля і паша — прыродаахоўныя зоны. Таму сметнікам стала... былая сажалка. Замест вады тут цяпер «квітнеюць» горы зелля з агародаў, бутэлькі, старыя рэчы, рэшткі будаўнічых матэрыялаў і нават газавыя пліты. Тыя ж, каму хадзіць сюды далёка, вывальваюць свае адходы проста ўздоўж дарогі — пад кусты. А які «палігон» утварыўся на месцы былога свінакомплекса...**

### Несанкцыянаваныя «сумёты»

Прынамсі, пару гадоў таму ў наша Браносава, што ў Карэліцкім раёне, прыязджалі прадстаўнікі мясцовай улады. Людзі тады адмаўляліся ад паслуг ЖКГ па вывазе смецця, ды і на пакеты пад адходы траціцца не хацелі. Гучала нават прапанова, як даўней, выкапаць яму на месцы, дзе калісьці стаяла гумно мясцовага памешчыка, і насіць смецце туды. Зразумела, старыя, якім амаль усім ужо добра за 70, не пагадзіліся хадзіць ледзь не за кіламетр ад хаты... Звалку на сажалцы гэтай вясной, дарэчы, падбурталі і забаранілі мясцовым насіць туды смецце. На ўездзе ў вёску спілавалі старыя дрэвы, пад якія таксама насілі бытавыя адходы. Аднак альтэрнатывы стыхійным сметнікам пакуль няма. Вось і працягваюць расці несанкцыянаваныя «смеццевыя сумёты» вакол вёскі.

Разам з тым, «афіцыйных» міні-палігонаў і пляцовак для часовага складзіравання смецця ў Карэліцкім раёне занадта шмат — 46. Каб утрымліваць усе ў парадку, трэба скараціць іх колькасць напалову. Такую задачу паставілі перад сабой мясцовыя ўлады.

— Карэліцкі райвыканкам у красавіку прыняў рашэнне аб замацаванні і ліквідацыі смеццевых палігонаў у раёне. Гэта значыць, што іх плануецца аптымізаваць. ЖКГ будзе даглядаць, як і раней, палігоны ў аграгарадках, а ў 11 буйных вёсках раёна замацуем гэтую адказнасць за СВК. Яны змогуць складзіраваць там таксама і свае адходы, — расказаў **Аляксандр ШКАДАЎ, старшыня Карэліцкага раённага Савета дэпутатаў.** — Але гэта часовая мера — з часам усе палігоны будуць абслугоўвацца сіламі ЖКГ. Астатнія 23 сметнікі давядзецца рэкультываваць, і на іх месцы пасадзіць лес. За 2016—2017 гады мы хочам ахапіць цэнтралізаваным вывазам смецця ўсе мястэчкі на 100%, незалежна ад таго, колькі людзей там жыве. Можа, гэта і амбіцыйная задача, але мы будзем імкнуцца вырашыць яе. Ёсць людзі ў вёсцы, якія ніколі не дазволяць сабе выкінуць смецце на вуліцу. З іншага боку, ёсць гараджане, што за горадам дазваляюць сабе «расслабіцца». Кінуць мех са смеццем у лесе, каля ракі, а то і праз фортку машыны шпульнуць у збожжа ці траву пры дарозе.



**Так выглядае міні-палігон каля аграгарадка Ярэмічы.**

### Людзей менш, а адходаў больш

Раней смецця было значна менш, і было яно больш экалагічнае, упэўнены мясцовыя жыхары. «Даўней у хлеў кідалі, палілі, а на звалку насілі бляшанкі ды шклянкі толькі». З гэтым згодны і **Пётр НАВУМОВІЧ, старшыня Ярэміцкага сельскага Савета:**

— Людзей было ў тры разы больш, а смецця значна менш. І перараблялася яно лягчэй. Тара выкарыстоўвалася па большасці папяровая — палілася. А цяпер што? Пластык — яго не спаліш. Раней смецце ўсё згнівала, а зараз з яго горы растуць.

На 111 км$^2$ сельсавета — 15 вёсак і адзін хутар. Цэнтралізаваны вываз смецця ёсць далёка не ў кожнай. Непадалёк ад агарагарадка Ярэмічы знаходзіцца міні-палігон для адходаў. У Сіняўскай Слабадзе, Баўцічах, Новым Сяле, Пагарэлцы размешчаны пляцоўкі для часовага складзіравання цвёрдых бытавых адходаў.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)***

# ЧЫМ ЗМОЖАМ, ДАПАМОЖАМ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Наступны прыпынак робім каля дома Аляксея Федасеева па вуліцы Пушкіна. Калісьці блізу яго гаража стаяў драўляны «электрычны» слуп, які нічым яму не перашкаджаў. Але яго памянялі на жалезабетонны і паставілі якраз насупраць уезду ў гараж. Мужчына, пакуль можна было, мірыўся з такім суседствам. Але пасля таго, як купіў большую машыну, заехаць у гараж стала праблематычна. «Электрыкі» на яго звароты не рэагавалі. Галоўны інжынер наогул сказаў: плаціце — і мы зробім каштарыс. «А чаму я павінен плаціць за чыесьці памылкі? — абураецца Аляксей Уладзіміравіч. — Няўжо яны не бачылі гараж, калі мянялі слуп? У мяне ёсць дакументы, дзе напісана, што гэта капітальная пабудова стаіць тут з 1982 года. А слуп з'явіўся ў 1997 годзе». Справа зрушылася з мёртвай кропкі толькі пасля звароту да дэпутатаў.

— А наогул работа дэпутатаў прыкметная? — пытаюся.

— Не ўсё у іх сілах, але ж яны не адмахваюцца, як некаторыя. Дарожныя ямы ў суседнім завулку залаталі — таксама з іх падачы. Хацелася б яшчэ, каб на нашай вуліцы Пушкіна асфальт памянялі. А то ён яшчэ з савецкіх часоў ляжыць. Перад самім Пушкіным нават сорамна. Два кіламетры асфальту ўсяго. А то пыл пастаянны, пясок...

— Мы гэта ўсё ведаем, — кажа Уладзімір Кніга. — Але зразумейце і нас. Вунь жыхары вуліцы Маладзёжнай звяртаюцца, каб прагрэйдзіравалі дарогу, хоць у іх па праекце быў прадугледжаны асфальт. Толькі грошай на яго не хапіла. Вуліца Калініна ў такім жа стане. А насупраць яе пасёлак ў гонар 50-годдзя Перамогі, куды пасля дажджоў пад'ехаць немагчыма. Дарогі — гэта боль усіх. Хочацца, каб яны былі ўладкаваныя, але дзе ўзяць грошы?

Яшчэ адзін жыхар Клічава Марат Храмянок жыве на вуліцы Магілёўскай. Балючае пытанне для яго таксама з разраду «дарожных». Пасля дажджу гравійка становіцца непралазнай. І тады ён тэлефануе дэпутатам, каб яе прагрэйдзіравалі. «Не было такога, каб мне адмовілі, — кажа ён. — А старшыня райсавета наогул чалавек слова. Калі нешта паабяцаў, можна не сумнявацца — выканае».

## Праблемы падштурхоўваюць

Свята вельмі дапамагае навесці парадак у асобна ўзятым населеным пункце. Сёлетнія «Дажынкі» ў раёне трэцяя па ліку. Першыя прайшлі ў Максімавічах, другія — у аграгарадку Нясята, цяпер выбралі Бацэвічы. Аграгарадок якраз знаходзіцца на рэспубліканскай трасе і трэба, каб выглядаў годна.

— Шмат чаго зроблена падчас раённага і рэспубліканскага суботнікаў, — кажа Уладзімір Кніга. — Тут працавала шмат арганізацый — выразалі кустоўе, добраўпарадкавалі могілкі, закінутыя ўчасткі. Цяпер працягваем займацца зносам спарахнелых дамоў.

Здалёк відаць аранжавы экскаватар Івана Шаўчонка з ПМК №89 «Вадбуд» , які наводзіць парадак на адной з такіх пляцовак. На чарзе вуліца Ленінская, а потым Успенская.

Знесці дом не праблема, цяжэй знайсці яго гаспадара і дамовіцца наконт будучага непатрэбнай яму нерухомасці. Дэпутаты займаюцца гэтым ушчыльную. Толькі ў Бацэвічах сёлета перадалі тутэйшай гаспадарцы «Бацэвічы-Агра» больш за 10 гектараў зямлі, вызваленай ад былых домаўладанняў. І працэс працягваецца.

Тыя ўчасткі, якія нельга далучыць да гаспадаркі, раённыя ўлады паспрабуюць прадаць праз аўкцыён. Магчыма, імі зацікавіцца прыватны бізнес. У безграшоўя ёсць і свае плюсы. Яно падштурхоўвае людзей быць ініцыятыўнымі. Седзячы склаўшы рукі, не разбагацееш. Цяпер у аграгарадку паспяхова працуе прадпрыемства «Элефант»,



Аляксей Федасееў паказвае той самы слуп.

якое займаецца дрэваапрацоўкай. Гэта і дадатковыя працоўныя месцы, і падаткі ў раённы бюджэт. Дарэчы, дзякуючы прадпрымальнікам Клічаў сёлета не застаўся без феерверку на Дзень Незалежнасці. Абышлося гэта ім у 18 мільёнаў. Але 6 хвілін былі запамінальнымі.

Насельніцтва ж добраўпарадкоўвае тэрыторыю вакол сваіх дамоў. На жаль, не ўсе робяць гэта ахвотна. Пейзаж псуюць перакошаныя агароджы.

— Некаторыя пенсіянеры адмаўляюцца нешта рабіць, спадзяюцца на нас, — кажа старшыня райсавета. — А калі пытаемся, чаму дзеці не дапамагаюць, разводзяць рукамі: ім самім няма калі. Але ж гэта не апраўданне.

Свае карэктывы ўносіць і надвор'е. Над раёнам пранёсся такі моцны ўраган, што пазрывала дахі з малочнатаварных ферм. Зноў незапланаваныя выдаткі.

## Раней было прасцей

Калі гараджан больш турбуюць дарогі, то для сельскай мясцовасці пытанне №1 — аварыйныя дрэвы.

— Летась да зімы знеслі па заяўках 36 дрэў, — сведчыць **старшыня Бацэвіцкага сельсавета Ганна МУХА.** — Людзі ўсю зіму нас добрым словам успаміналі. У лютым такая бура была з ледзяным дажджом — жах. Яшчэ страшней падумаць, што магло б здарыцца, калі б мы не прыбралі тыя аварыйныя дрэвы.

Здараюцца ў сельсавеце і такія выпадкі, калі жыхары не скардзяцца, а бяруць ініцыятыву ў свае рукі. Старшыня сельсавета ставіць у прыклад Надзею Каламейцаву з Бацэвіч — вельмі актыўная староста. Яна не толькі арганізавала збор сродкаў на фарбу для агароджы мясцовых могілак, але і знайшла аднадумцаў, каб яе пафарбаваць. У суседніх Любічах таксама не трэба было прымушаць людзей збіраць грошы для афарбоўкі агароджы на могілках.

— Раней, калі афіцыйна існаваў такі від плацяжу, як самаабкладанне, было прасцей займацца добраўпарадкаваннем, — прызнаецца Ганна Муха. — Але некалькі гадоў таму яго адмянілі. Цяпер, каб вырашыць пытанне з добраўпарадкаваннем, кожны раз трэба шукаць нейкае выйсце. Хоць у савецкі час такі плацеж таксама існаваў. У пагаспадарчых кнігах усё распісана: колькі сабралі, куды патрацілі.

— Наколькі сёння складана быць дэпутатам? — пытаюся ва Уладзіміра Кнігі, калі мы вяртаемся зноў у Клічаў.

— Вядома, складана, — не хавае ён. — Раённы бюджэт у параўнанні з мінулым годам скарацілі на 21 мільярд недэнамінаваных рублёў, напружанасць на рынку працы ўзрасла і скарацілася колькасць мясцовых падаткаў. Усё гэта накладае адбітак на пытанні добраўпарадкавання. Нам яшчэ цяжка і таму, што ў нас самы нізкі кошт гігакалорыі па вобласці. І мы менш за астатніх атрымліваем датацыю на кампенсацыю затрат, звязаных са спажываннем вады. Падняць цану немагчыма, бо сёння існуе патрабаванне зніжаць сабекошт вытворчасці.

*zigulya@zviazda.by*

ДАРОГАЮ ДАБРА

# І КАРАБЕЛЬ ПЛЫВЕ!..

***У аграсядзібе стварылі творчую майстэрню для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі***



Карабель — творчая майстэрня.

**У вёсцы Карэвічы Свіслацкага раёна каля рэчкі Рось нядаўна з'явіўся... карабель. Велічны, прыгожы, быццам сапраўднае драўлянае судна з далёкай мінуўшчыны. Гэта творчая майстэрня для маладых людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, якіх тут гасцінна сустракаюць Яніна і Рышард КАЗЮКІ — гаспадары аграсядзібы «Фальварак «У Рыся». Будаўніцтва гэтага дзівоснага карабля ажыццявілася дзякуючы іх ініцыятыве «Запаліць зорку», якая перамагла ў конкурсе і атрымала фінансавую падтрымку праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні».**

Для Яніны Казюк клопаты людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі ніколі не былі чужымі. Больш за тое, яна прафесіянальна працавала ў гэтай сферы як дырэктар Ваўкавыскага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. А як гаспадыня аграсядзібы сацыяльнай рэабілітацыяй інвалідаў пачала займацца чатыры гады таму.

— Неяк да нас прыехалі два маладыя інваліды, папрасіліся паначаваць, — расказвае Яніна Казюк. — Канешне, мы не адмовілі, але мне стала сорамна, што няма належных умоў для людзей з абмежаванымі фізічнымі

> **Уладзімір АНІШЧЫК, старшыня Свіслацкага райвыканкама:**
>
> — На Свіслаччыне рэалізавана нямала гуманітарных праектаў, і гэты фестываль, мэта якога — сацыялізацыя і інтэграцыя людзей з абмежаванымі магчымасцямі, папоўніць скарбонку добрых спраў. Тое, што мы бачым тут, у аграсядзібе, гэта праяўленне клопату, увагі да тых людзей, якія ў гэтым асабліва маюць патрэбу.

магчымасцямі. Тады мы з мужам і вырашылі абсталяваць аграсядзібу адпаведнай інфраструктурай.

І зрабілі! Прычым, не абмежаваліся толькі абавязковым наборам сродкаў і прыстасаванняў для зручнасці інвалідаў. Заснавалі сацыяльна-дабрачыннае аб'яднанне «Дарогаю дабра», устанавілі трэнажоры, абсталявалі спартыўную пляцоўку, пабудавалі кавярню, дзе госці з інваліднасцю абслугоўваюцца бясплатна. Аграсядзіба прыцягвае нямала кліентаў, а сродкі, якія зарабляюцца, гаспадары накіроўваюць на дабрачыннасць, прыём людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Як правіла, яны гасцююць тут два дні ў тыдзень.

— Творчая майстэрня паслужыць сацыяльнай адаптацыі маладых інвалідаў, рэалізацыі іх здольнасцяў, — кажа Яніна Казюк. — Прыкладзём усе намаганні, каб гэта атрымалася ў кожнага з нашых гасцей.

Заняткі, трэнінгі, майстар-класы будуць праводзіць спецыялісты цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання і іншыя партнёры дабрачыннага аб'яднання «Дарогаю дабра». Акрамя таго, у аграсядзібе плануюць стварыць і рабочыя месцы для маладых людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Іх навучаць ганчарнай справе і пастараюцца дапамагчы ў рэалізацыі вырабаў.

...Урачысты пуск творчага карабля «ў плаванне» (са сцягам «Дарогаю дабра») прымеркавалі да фестывалю «Музыка дзіцячых сэрцаў», на які ў аграсядзібу прыехалі 328 маладых людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Спачатку запрасілі выхаванцаў Свіслацкага і Ваўкавыскага цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, а потым зацікавіліся і Зэльвенскі, Дзятлаўскі, Слонімскі цэнтры. Дзеці падрыхтавалі выдатны канцэрт — з песнямі, танцамі, вершамі, ігрой на музычных інструментах, тэатралізаванымі пастаноўкамі, а прадоўжылі свята самадзейныя артысты з Гродзеншчыны і Брэстчыны. Са сваімі цікавінкамі на фестываль прыехалі з розных рэгіёнаў рамеснікі, за цудоўных дам змагаліся рыцары клуба славянскіх адзінаборстваў «Арыдан», можна было сесці за ганчарны круг альбо ўбачыць, як нашы продкі стрыглі барана...

— Мы вельмі ўдзячныя за спонсарскую дапамогу і падтрымку ў правядзенні фестывалю Свіслацкаму райвыканкаму, прадпрыемствам і арганізацыям, артыстам. Усё рабілася на дабрачыннай аснове, са шчырым жаданнем крочыць дарогаю дабра. А галоўнае, мяркуючы па водгуках, у тым, што свята спадабалася яго юным удзельнікам, — падзялілася ўражаннямі Яніна Казюк.

Дарэчы, Яніна Тадэвушаўна ўжо цяпер думае над тым, каб, улічыўшы вопыт першага фестывалю «Музыка дзіцячых сэрцаў», наступны зрабіць яшчэ больш цікавым.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*



Фота Рыгора ШЫРАЕВА.

На фестывальнай сцэне.

> **У тэму**
>
> *На першым этапе праекта ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» на Гродзеншчыне падтрыманы 10 заявак, у тым ліку і яшчэ адна ініцыятыва Свіслацкага раёна — «Другое жыццё векавога парку».*
>
> *Паводле інфармацыі **каардынатара праекта па Гродзенскай вобласці Аляксандра ШУХНО,** у другім этапе паўдзельнічаюць 5 раёнаў — Свіслацкі, Зэльвенскі, Слонімскі, Навагрудскі і Смаргонскі. Там створаны групы ў складзе прадстаўнікоў органаў улады, грамадскіх аб'яднанняў, зацікаўленых жыхароў, якія прапануюць на конкурс свае ініцыятывы па самых розных пытаннях рэгіянальнага развіцця. Кожнаму раёну праект акажа фінансавую падтрымку ў суме каля 40 тысяч еўра.*

## Лесавозы на штрафстаянцы

**За адзін дзень з інтэрвалам у гадзіну работнікі Мікашэвіцкай міжрайінспекцыі ў Мікашэвічах затрымалі два грузавікі з дзелавой драўнінай елкі агульным аб'ёмам звыш 50 кубаметраў.**

Аднак у прадстаўленых кіроўцамі для праверкі суправаджальных дакументах было ўказана зусім іншае найменне прадукцыі, чым тая, што перавозілася. Падчас разбору было ўстаноўлена, што апошняя адгружана ў адным і тым жа квартале аднаго з лясніцтваў Петрыкаўскага лясгаса, там жа выпісаны і сумнеўныя суправаджальныя дакументы. На месца прыбыла следча-аператыўная група Лунінецкага РУУС. Лесавозы з драўнінай дастаўлены на штрафную стаянку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЦІ ЁСЦЬ АЛЬТЭРНАТЫВА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Праз пэўны час іх трэба рэкультываваць, а ў працэсе карыстання падбуртоўваць як мінімум два разы на год: перад вясеннімі пасадкамі і пасля збору ўраджаю — тады б і парадак быў, — разважае Пётр Анатолевіч. — Пры гэтым трэба рабіць да палігона дзве дарогі: на ўезд і выезд машыны. Часта там немагчыма развярнуцца, таму вадзіцель скідвае ўвесь груз туды, куды змог даехаць. А іншы пасля гэтага ўжо далей не праедзе. Вось і выходзяць цераз берагі смеццевыя рэкі.

У саміх Ярэмічах на 9 пляцоўках стаяць 23 кантэйнеры для смецця, ёсць нават ёмістасці для асобнага збору. Кантэйнерны вываз смецця наладжаны і ў Пагарэлцы, пасёлку Першамайскі, Скорычах, Малой і Вялікай Вобрыне. У больш дробных вёсках на вуліцу выстаўляюць пакеты са смеццем, якія па пятніцах забірае машына.

— Гэта вельмі зручна, бо можна пакінуць смецце бадай што адразу за веснічкамі. Аднак мы просім, каб людзі хоць крыху аб'ядноўваліся і некалькі двароў разам у адным месцы складвалі, — працягвае старшыня. — Напрыклад, за метраў 20 ад крамы ў Вялікай Вобрыне мы абазначылі месца для смецця — паставілі рашотку літарай «П». І людзі кладуць туды пакеты, і ветрам іх не раздувае. У выніку стала значна менш смецця на стыхійных звалках.

## Падрыхтаваць глебу

Цэнтралізаваны вываз смецця ў раёне пачаўся гадоў 8 таму — з закупкі трох МАЗаў, сродкі на якія выдзеліла Міністэрства аховы прыроды. Аднак тэхнікі, каб вывозіць смецце з усіх мястэчак, усё роўна не хапала. Тым больш што абслугоўваць яна магла толькі кантэйнеры, якія стаяць у аграгарадках.

— Была дамоўленасць з СВК, каб вывозіць смецце ў пакетах, але тэхніка часта не даязджала, бо ламалася ці паліва не хапала, і вываз быў нерэгулярны, — успамінае Пётр Навумовіч. — Цяпер закупілі новую тэхніку: работнікі закідваюць у машыну пакеты, прэсам утрамбоўваюць іх і едуць далей. Цяпер так можна абслугоўваць увесь раён.

Па дамове з ЖКГ плануецца заключыць круглагадовыя дагаворы з усімі жыхарамі навакольных вёсак сельсавета. Акрамя Зарэчча (там жыхары толькі летам прыязджаюць і смецце вывозяць па дарозе дахаты) і Сіняўскай Слабады, бо да яе дабрацца можна толькі наўкруг, пакуль мост не пабудуюць.

— Перш чым прапаноўваць заключаць дагаворы, трэба падрыхтаваць глебу. Расказаць у прыватных размовах, як будзем рабіць і што, каб людзі прывыклі да гэтай думкі. Галоўнае, не настойваць, а пасля, упэўнены, усе пагодзяцца плаціць за вываз смецця, бо гэта нядорага — 1 рубель з чалавека за месяц, — адзначыў старшыня. — Можна нават не купляць пакеты — вынесіце смецце ў вядры. Яго забяруць, а тару пакінуць.



Фота Ірыны СІДАРОК.

А гэта былая сажалка ў вёсцы Браносава.

Праўда, не ўсе вераць, што пачынанне спраўдзіцца.

— Калі будуць прыязджаць па смецце, дык чаму б і не заплаціць? А то цяпер мы захламліваем дарогу, на пашу носім, у зараснікі кідаем. А куды дзецца? — разважаюць жыхары Браносава.

## Відэакамера на сметніку

Калі знойдуцца асабліва ўпартыя, што не пагодзяцца з прапановай, то можна да справы і санстанцыю падключыць. Нават утрыманне ўласнага падвор'я ў неналежным стане — прычына для штрафу. Не тое што стыхійныя звалкі. Аднак гэта апошняя справа, да якой не павінна дайсці, упэўнены кіраўнік.

Дарэчы, аштрафаваць за незаконны вынас смецця цяжка — трэба злавіць за руку. Інакш не дакажаш, чыё гэта «дабро». Калі знаходзяць чарговую стыхійную звалку, ва ўладаў пачынаецца работа накшталт дэтэктываў. Усе ведаюць адзін аднаго, і па месцы, дзе выкінута смецце, можна зрабіць здагадку, чыё яно.

— Ідзём да гэтых людзей, пытаемся. Яны, вядома, не прызнаюцца. Тады мы кажам, што паставім на тым месцы відэакамеру, каб даведацца, хто злодзей, — смяецца Пётр Анатолевіч. — Пасля на тую звалку ўжо смецце не панясуць, і мы яе ліквідуем. На лета наймаем двух чалавек ад цэнтра занятасці, і яны дапамагаюць упарадкаваць тэрыторыю. Абкошваюць вуліцы, дапамагаюць у дварах ветэранам і адзінокім, збіраюць па берагах ракі і ўздоўж дарог смецце. Было б добра ўздоўж дарогі на аўтобусных прыпынках таксама паставіць кантэйнеры. Маленькая сметніца не вытрымлівае, бо ў сезон па выхадных сотні людзей на Нёман прыязджаюць.

Дагаворы на вываз смецця заключаюць нават з дачнікамі. Многія наязджаюць толькі на выхадныя і вывозяць пакеты са смеццем з сабой. Аднак калі мясцовыя бачаць, што дачнік не плаціць за абслугоўванне, а смецце ў кантэйнер выносіць, пачынаецца агульнае абурэнне. І прыезджаму прасцей аформіць дагавор.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

СВАЯ СПРАВА

# САКРЭТ ДОБРАГА ЎРАДЖАЮ

**Вольга і Аляксей Цывісы жывуць у аграгарадку Беражное, што на Століншчыне. Не першы год сям'я займаецца вырошчваннем агародніны, якая ідзе не толькі на ўласны стол, а і на продаж.**

Аляксей — мясцовы, а вось Вольга — з Ганцаўшчыны, дзе нарадзілася і вырасла. Пасля разам з мужам вучыліся ў Пінску. Атрымалі дыпломы настаўнікаў фізічнай культуры, а потым на некаторы час іх разлучыла размеркаванне. Але вось ужо сем гадоў сям'я жыве ў Беражным, выхоўваюць дачушку Дашу.

Цывісы ўдала сумяшчаюць работу ў школе (Вольга) і мясцовым СВК (Аляксей) з работай на сваім прысядзібным участку. Ні для кога не сакрэт, што свайго жылля з зарплаты не прыдбаеш, таму даводзіцца круціцца. Цяпер муж і жонка будуюць уласны дом.

Ужо не першы год у парніках Вольгі і Аляксея растуць агуркі і таматы. Таматы — гэта асаблівае захапленне гаспадыні, у яе свая тэхналогія, якую назапасіла з гадамі. Штогод ужо ў чэрвені таматы паспяваюць у парніках. У канцы чэрвеня пачынаецца масавая здача чырвоных прыгажуноў. Штодня Вольга Цывіс выпраўляецца ў парнік, дзе ў яе ідэальная чысціня. Таматы — вялізныя, прыгожыя — не хаваюцца за вялікімі лістамі, а выстаўляюць свае бакі сонцу.

— Старанна абразаю лісты і ўсе «пасынкі», — дзеліцца тэхналогіяй гаспадыня. — Калі таматы падрастаюць да дроту, то апускаю ніз кожнай расліны, каб ляжала на зямлі, а верх — зноў падвязваю. Гэта дае магчымасць сабраць большы ўраджай.

Штогод 6 верасня Вольга Цывіс адшчыпвае вярхушкі сваім гадаванцам. З іх ужо нічога не вырасце, а трэба даць магчымасць даспець тым памідорам, якія завязаліся. Некалькі гадоў назад прымалі ўдзел у эксперыменце па апыленні таматаў чмялямі.

— Цяпер я сама, як тая пчолка, штодня з 10 да 11 абавязкова прыходжу ў цяпліцу і палачкай б'ю па дроце, да якога падвязаны таматы. Вось так і апыляю, — выдае яшчэ адзін «сакрэцік» Вольга.

Гадоў сем таму спрабавалі таматы прышчэпліваць. Вырошчвалі асобна прышчэпы і сартавыя. На прышчэпы — таматы з моцнай каранёвай сістэмай — прышчаплівалі сартавыя. Тады гэта быў гібрыд «Ралі». Але ніякіх дзіваў эксперымент не прынёс. Таму зноў вырошчваюць таматы звычайным спосабам.

Любоў да памідораў Вольга пераняла ад бацькі. Той кожны год вырошчвае самыя розныя іх гатункі.

А сёлета Вольга Цывіс прымае ўдзел у эксперыменце па вы-



рошчванні ў закрытым і адкрытым грунце перцаў. Эксперымент праводзіцца ў рамках праекта ExNet (Сетка агароднікаў Століншчыны), што рэалізуецца Цэнтрам сельскага развіцця. У закрытым грунце на плошчы ў 3 соткі перцы вялікія і прыгожыя. На вуліцы яны значна слабейшыя: пахаладанні пакідаюць свой адбітак.

Яшчэ летась гаспадары прымалі ўдзел у эксперыменце «Амінакіслотныя ўгнаенні на тамаце», які праходзіў у рамках таго ж праекта.

— Эфект было відаць адразу, калі таматы толькі пачыналі расці. Тыя, што без амінакіслот, былі значна слабейшымі, — дзеліцца Вольга Цывіс.

Добра спраўляецца сям'я і з вырошчваннем агуркоў. Заўжды да маразоў збіраюць добры ўраджай. Гляджу на парадак і чысціню, якая пануе ў цяпліцах, і разумею, што не толькі ў добрым веданні тэхналогіі вырошчвання, а і ў клопаце, любові да справы сакрэт добрага ўраджаю.

Эксперыментаў па вырошчванні гародніны ў Цывісаў было шмат. Акрамя пералічаных, вырошчвалі пекінскую капусту ў другім севазвароце.

— У той год наша капуста вырасла па два кілаграмы кожны качан. Вывозілі оптам у Пінск — прадаўцы з радасцю забіралі, — расказвае гаспадыня.

Збываць пекінскую капусту спрабавалі па-рознаму. У хляве ставілі печкі, каб ацяпляць сціrты гародніны — так і захоўвалі яе да Новага года, калі цана вышэйшая. У першы год, сабраўшы ўраджай, кожны качан адразу запакавалі ў плёнку. Але больш так не робяць, бо капуста псуецца хутчэй. Цяпер захоўваюць адразу без упакоўкі, а перад продажам пакуюць.

Сёлета пасля таго, як з расадніцы ўсё было высаджана, у ёй пасеялі радыску. Мелі таксама неблагі ўраджай. Плануюць і ў наступным годзе гэтак жа зрабіць.

**Таццяна СЕГЕН.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ. ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 44 12;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 2 жніўня 2016 года.**

ГЛУША Адамовіча

# ЁН НІКОЛІ НЕ КРЫВІЎ ДУШОЙ

**Сёння вядомаму беларускаму пісьменніку Алесю Адамовічу споўнілася б 90 гадоў. Ніякай памылкі няма. Сам пісьменнік у сваёй анкеце пісаў іншую дату нараджэння — 3 верасня 1927 года. Але падчас вайны яго «памаладзіла» маці, каб сына не ўгналі ў Германію. Насамрэч ён жнівеньскі, з 1926 года.**

**«Звязда» працягвае праект «Глуша Адамовіча» дзеля ўшанавання памяці пісьменніка і адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці музея «Вайна пад стрэхамі» — своеасаблівага помніка героям яго дылогіі «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой». Усім тым, хто змагаўся на перадавой і ў тыле, ахвяраваў сваім жыццём на самай крывавай вайне XX стагоддзя.**

**Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа, публіцыст, крытык, кінасцэнарыст — у жыцці ён паспеў многае. На яго лёс вельмі паўплывала вайна, навучыла разбірацца, дзе чорнае, а дзе белае. Напэўна таму ён на ўсё жыццё застаўся максімалістам, вельмі балюча рэагаваў на несправядлівасць. Ён ніколі не быў канфармістам, гаварыў і пісаў толькі тое, што сапраўды думаў. І гэта не ўсім падабалася. Апошнія гады жыцця ён правёў у Маскве, бо быў абраны дырэктарам Усесаюзнага НДІ кінамастацтва, а таксама з'яўляўся народным дэпутатам СССР. Але нават пры такой вялікай занятасці ні на адно імгненне не забываў пра Глушу. Першы трывожны званочак прагучаў для яго 21 снежня 1991 года, калі ён перанёс цяжкі інфаркт міякарда. Праз два з невялікім гады яго не стала. 30 студзеня 1994 года ён быў пахаваны ў Глушы побач з братам, недалёка ад магіл бацькоў і бабулі. Гэта было яго асабістае, прынцыповае пажаданне. Напярэдадні біялагічнага дня нараджэння Алеся Адамовіча мы наведалі пасёлак, пакланіліся яго магіле і пагутарылі з тымі, для каго гэта імя не просты гук.**



Таццяна ПЕТУХОВА дэманструе каштоўны для гісторыі альбом.

## ...У ГЛУШУ! У ГЛУШУ! У ГЛУШУ!

Стаю на прыпынку вакзала ў Бабруйску, а ў вушах гучыць вось гэты знакаміты адамовіцкі рэчытатыў. Ён нарадзіўся ў Канюхах, але менавіта Глуша стала для яго родным домам. «Забалацце, Рачэнь, Канюхі — усё гэта назвы, кропкі пашпартныя. А сапраўдная малая радзіма, дзе я ўваходзіў ва ўзрост і ў жыццё, — рабочы пасёлак Глуша», — чытаем у яго апошнім пасмяротным зборніку «Vixi». Маленькі населены пункт, які на некалькі кіламетраў працягнуўся ўздоўж «варшаўкі». «На гэтую асфальтавую стралу столькі ўсяго нанізана», — разважаў пісьменнік, успамінаючы пра яўрэяў-балагулаў, якія вазілі бутэлькі ў горад на конях, нямецкія танкі, якія спачатку лязгалі на ўсход, а потым ганебна беглі, уцякаючы ад Чырвонай Арміі. Па гэтай дарозе і сам ён колькі разоў вяртаўся ў Глушу да сваіх бярозак каля дома.

Вось мы і на месцы, арыентуюся я, убачыўшы з акна аўтобуса знакаміты дом былой аптэкі. Будынак, дзе павінен калісьці адкрыцца доўгачаканы музей. Бо менавіта тут адбываліся галоўныя падзеі ваеннай дылогіі Адамовіча. Тут некаторы час жыла сям'я Адамовічаў, перад тым, як атрымаць жытло насупраць цераз дарогу. На жаль іх бацька Міхаіл Іосіфавіч, вельмі таленавіты ўрач, не дачакаўся гэтай шчаслівай хвіліны. У 1948 годзе ён адправіўся ноччу на дапамогу парадзісе, але прастыў на пранізлівым ветры, падхапіў запаленне лёгкіх і хутка згарэў. Наваселле Адамовічы справілі без яго, у 1954 годзе. У гэтым доме да апошняга дня жыла гераічная маці Алеся Адамовіча — Ганна Мітрафанаўна, галоўная гераіня кніг «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой» Ганна Карзун. Сюды да яе і да родных яму бярозак спяшаўся Алесь.

Яны і цяпер тут растуць. Летам дом зноў напаўняецца галасамі. Сюды прыязджае дачка пісьменніка Наталля, яе стрыечныя сёстры, іх дзеці і ўнукі. На жаль, падчас майго візіту дома нікога не аказалася. За акном убачыла толькі пакінуты на стале кубачак і стосік кніг. Потым па тэлефоне з Наталляй Адамовіч мы доўга размаўлялі пра яе бацьку.

— Ён вельмі любіў гасцей, — казала яна. — Але хмялеў не ад гарэлкі, яе ён ніколі не піў. Ён быў п'яны ад зносінаў з роднымі і блізкімі яму па духу людзьмі.

Адчуць прысутнасць у Глушы Алеся Адамовіча дапамаглі зацікаўленыя ў адкрыцці музея старшыня Глушанскага пасялковага савета Марыя Сушчанка і яе папярэднік на гэтай пасадзе Фёдар Бязручка. Менавіта Фёдару Фёдаравічу выпала місія арганізаваць па ініцыятыве мясцовага шклозавода 60-гадовы юбілей Алеся Адамовіча ў Глушы. Віншавалі пісьменніка прама ў школе.

Адамовіч запомніўся Фёдару Фёдаравічу як чалавек інтэлігентны і вельмі сціплы. Як, дарэчы, і яго маці — Ганна Мітрафанаўна. З усмешкай успамінае, як падлеткам бегаў у аптэку, дзе яна працавала загадчыцай, здаваць сушаныя смаржкі.

Так склаўся лёс, што ён займаўся і пахаваннем пісьменніка. Маленькая Глуша ў тыя сумныя дні пабачыла шмат знакамітых асоб. З Масквы прыехаў цэлы аўтобус з пісьменнікамі. Яшчэ адзін, таксама «пісьменніцкі», прыбыў з Мінска.

Пасёлак Глуша, які паявіўся на свет дзякуючы шклозаводу, так і не абзавёўся сваімі могілкамі. Дагэтуль яго жыхароў хаваюць на Дойнічаўскіх, за тры кіламетры ад пасёлка. Там, сярод тых, пра каго любіў і з кім дзяліў радасці і няшчасці, вечным сном спіць Алесь Адамовіч, чалавек з чулым сэрцам і вялікай душой. Непадалёк магіла яго любай матулі, спагаднай жанчыны і гераічнай падпольшчыцы. Менавіта яе ўспаміны ляглі ў аснову дылогіі «Сыны ідуць у бой» і «Вайна пад стрэхамі». Тыя, хто бачыў Ганну Адамовіч, успамінаюць яе, як жанчыну рэдкай прыгажосці. Яна і на помніку такая, што вачэй не адвесці. А два гады таму побач з магілай Алеся Адамовіча паявілася яшчэ адна — яго жонкі Веры Сямёнаўны, якая перажыла мужа на 20 гадоў.


Ганна Мітрафанаўна была сапраўднай прыгажуняй.

## ПАЦЕРКА НА ТОНКАЙ НІТАЧЦЫ

Школы, дзе вучыўся Адамовіч, на жаль, няма. Яна цалкам згарэла. Кажуць, нехта забыўся выключыць абагравальнік у бібліятэцы. Замест яе пабудавана новая — вялікая і prасторная. У ёй таксама не раз бываў Алесь Адамовіч. Сімвалічна, што знаходзіцца яна на вуліцы, названай у яго гонар. Пры жыцці пісьменніка вуліца называлася проста — Школьная.

Настаўнікі разам з вучнямі сабралі шмат карыснага матэрыялу пра гісторыю вёскі, ие ваеннае мінулае і, канешне, ие песняра — Алеся Адамовіча. Намеснік дырэктара школы Таццяна Петухова, якая шмат гадоў займаецца краязнаўствам і праводзіць экскурсіі, дэманструе некалькі важкіх папак і альбомаў з каштоўнай інфармацыяй. Калі ў пачатку 2000-х шклозавод быў прызнаны банкрутам, усе гістарычныя звесткі, звязаныя з яго існаваннем, перадалі ў школу. Асобны альбом прысвечаны ветэранам партызанскай брыгады № 161 імя Р. Катоўскага, яшчэ некалькі — непасрэдна Алесю Адамовічу. А галоўнае — распрацаваны экскурсіі, якія і сёння запатрабаваныя.

— Гэта калектыўная работа нашых настаўнікаў і бібліятэкара Алены Уладзіміраўны Кісляк, старэйшага работніка школы, — кажа Таццяна Фёдараўна. — Ёсць нават дыск з запісам экскурсіі, якую праводзіць наша вучаніца. Яна ідзе па вуліцы Адамовіча, спыняецца каля дома сям'і, аптэкі, выходзіць на плошчу з помнікам «Маці, якая смуткуе». Потым падзеі перамяшчаюцца на могілкі. Там мы ўспамінаем пра вайну, лётчыкаў, якія загінулі ў 1941-м, пра сямейства Адамовічаў.

Таццяна Петухова кажа, што, калі музей адкрыецца, увесь гэты каштоўны матэрыял перададуць туды. Яна лічыць, што размову пра Адамовіча нельга пачынаць без экскурсу ў мінулае Глушы. Гэта ўзаемазвязана і нельга раздзяляць.

— Пасёлак сёння ведаюць больш дзякуючы фестывалю «Глушанскі хутарок». Але ж ёсць рэчы больш грунтоўныя. Адамовіч — асоба з сусветным іменем. Цяпер у Глушу прыязджаюць, каб адпачыць у аграсядзібах. Але, калі б тут быў музей, адпачынак набыў бы зусім іншую вагу. Зараз шмат моладзі падарожнічае па Беларусі, ім цікава гісторыя краю. Адамовіча нашчадкі павінны ведаць, бо ў яго шмат чаму можна павучыцца. Каб зразумець пісьменніка, перш за ўсё трэба прачытаць яго творы. І музей можа стаць для гэтага добрым стымулам. Хай адзін з 10 пачуе, прапусціць праз сэрца, але зерне будзе ўжо кінутае, — кажа яна.

«Глуша — маленькая кропка на карце — пацерка на тонкай нітачцы», — пісаў Алесь Адамовіч. Пацерка, якая можа заблішчаць і гэтым прывабіць турыстаў. Адамовіча нездарма лічаць чалавекам свету. Ён паспеў пабываць у многіх краінах, расказаць пра сваю вялікую і малую радзіму. Яго творы перавыдаюцца ў Францыі, Англіі. Калі стане вядома, што ў Глушы ёсць музей, прысвечаны яго кнігам, раёну не трэба будзе нешта прыдумваць, каб сюды паехалі зацікаўленыя людзі, у тым ліку і з-за мяжы.

## СТВОРЫМ МУЗЕЙ РАЗАМ

Сёлета быў адкрыты разліковы рахунак для збору сродкаў на стварэнне ў Глушы музея «Вайна пад стрэхамі». На жаль, грошы паступаюць вельмі марудна. Ахвяруюць у асноўным звычайныя беларусы з Магілёва, Бабруйска, Глушы, Мінска, Гомельскай, Віцебскай абласцей... Сярод тых, хто пералічыў сродкі на рахунак, цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Бабруйскага раёна, Бабруйскі райвыканкам і райсавет дэпутатаў. Здзівіла, што дагэтуль сваю лепту не ўнёс Саюз пісьменнікаў Беларусі. У свой час шмат пісала пра адсутнасць разліковага рахунку прыватная прэса. Рахунак нечакана спрацаваў па прынцыпе лакмусавай паперы. Яго стварылі, а ў адказ — цішыня.

На рахунку ўсяго крыху больш як 900 дэнамінаваных рублёў. Мы падлічылі, што калі справа і далей пойдзе такімі тэмпамі, музей адкрыецца не раней чым праз 100 гадоў. Іншымі словамі — ніколі. Не вельмі прыемныя перспектывы.

Напэўна, мы проста забыліся, што прозвішча Алеся Адамовіча сёння стаіць у адным шэрагу з імёнамі выдатных асоб XX стагоддзя. Менавіта ён стаў заснавальнікам асобага жанру нон-фікшн, вельмі папулярнага сёння. Гэта калі літаратурная творчасць жорстка прывязаная да канкрэтных, рэальных падзей. Знакаміты сучасны пісьменнік, выкладчык літаратуры, тэлевядучы Дзмітрый Быкаў называе Адамовіча тэарэтыкам літаратуры, якая «эмацыянальна мацнейшая, страшнейшая, бо пазбягае выдумкі, пазбягае літаратурных прыёмаў. Гэта непасрэдны, жывы кантакт з рэальнасцю. Гэта «перадавы атрад» літаратуры. Гэта як санітары, якія першымі кідаюцца ў бой, маюць справу з крывёю, з порахам, самі рызыкуюць».

На Магілёўшчыне няма лепшага літаратурнага помніка пра Вялікую Айчынную вайну, чым той, што стварыў Алесь Адамовіч. Трагедыя вёсак Кіраўскага раёна апісана ў жахлівай аповесці «Карнікі», па якой пастаўлены самы праўдзівы фільм пра вайну «Ідзі і глядзі». Дылогія — «Сыны ідуць у бой» і «Вайна пад стрэхамі» — даніна памяці падпольшчыкам і партызанам Бабруйскага, Глускага раёнаў. Гэтыя творы існуюць яшчэ і ў экранізаваным варыянце, а ваенныя песні, якія да гэтых стужак напісаў Уладзімір Высоцкі, адны з самых кранальных па змесце. Я ўжо не кажу пра кнігу «Я з вогненнай вёскі», якую рабілі разам Алесь Адамовіч, Уладзімір Калеснік і Янка Брыль. Яе наогул нельга чытаць без слёз. Гэта тая літаратура, без якой немагчыма выхаваць сапраўдных патрыётаў.

Сёння дзень нараджэння вялікага пісьменніка. Выказаць сваю ўдзячнасць за тое, што ён стварыў, можна добрай справай. Гэтым мы зробім падарунак зусім не яму. Гэты музей патрэбны нам!

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

***Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама р/р 3642129272326 у філіяле 703 ААТ АБ «Беларусбанк», код 706, г. Бабруйск, УНП 701226324.***

***Прызначэнне плацяжу «Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча».***



У школьнай бібліятэцы ёсць куточак, прысвечаны пісьменніку.


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»**, г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | **ОАО «Белинвестбанк»**, г. Минск, пр-т Машерова, 29 |

**Предмет аукциона**

**Лот №1. Гараж**, общ. пл. 20,3 кв.м, в т.ч. погреб и смотровая яма, инв. № 700/С-90093, адрес: Могилевская обл., **г. Могилев**, р-н пр. Шмидта – ул. Габровской, блок 13, гараж 5. Начальная цена с НДС 20% – **4 367,30 бел. руб.** (43 673 040 бел. руб.)

**Лот №2. Гараж**, общ. пл. 20,1 кв.м, в т.ч. погреб и смотровая яма, инв. № 700/С-90094, адрес: Могилевская обл., **г. Могилев**, р-н пр. Шмидта – ул. Габровской, блок 13, гараж 6. Начальная цена с НДС 20% – **4 367,30 бел. руб.** (43 673 040 бел. руб.)

**Лот №3. Гараж**, общ. пл. 19,7, в т.ч. погреб и смотровая яма, инв. № 700/С-90095, адрес: Могилевская обл., **г. Могилев**, р-н пр. Шмидта – ул. Габровской, блок 13, гараж 18. Начальная цена с НДС 20% – **4 609,93 бел. руб.** (46 099 320 бел. руб.)

**Лот №4. Гараж**, общ. пл. 18,7 кв.м, в т.ч. погреб и смотровая яма, инв. № 700/С-90096, адрес: Могилевская обл., **г. Могилев**, р-н ГСК з-да «Техноприбор», блок 18, гараж 968. Начальная цена с НДС 20% – **3 882,05 бел. руб.** (38 820 480 бел. руб.)

**Лот №5. Гараж**, общ. пл. 18,7 кв.м, в т.ч. погреб и смотровая яма, инв. № 700/С-90097, адрес: Могилевская обл., **г. Могилев**, р-н ГСК з-да «Техноприбор», блок 18, гараж 969. Начальная цена с НДС 20% – **3 882,05 бел. руб.** (38 820 480 бел. руб.)

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, производит оплату приобретаемого объекта недвижимого имущества следующим образом:
**Вариант 1:**
100% от стоимости реализации объекта недвижимого имущества оплачиваются в течение 15 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи. Передача объекта недвижимого имущества покупателю производится в течение 5 рабочих дней с момента полной оплаты его стоимости.
**Вариант 2:**
В течение 15 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи покупатель обязан оплатить 20% от стоимости реализации объекта недвижимого имущества.
Оставшаяся часть оплачивается ежемесячно в течение 12 месяцев с момента заключения договора купли-продажи равными долями с уплатой процентов за пользование рассрочкой в размере 0,5 ставки рефинансирования Национального Банка Республики Беларусь. При этом покупатель обязан в течение 15 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи предоставить банковскую гарантию об уплате гарантом в пользу ОАО «Белинвестбанк» оставшейся суммы денежных средств, включая НДС и проценты за пользование денежными средствами в случае нарушения покупателем обязательств по оплате объекта недвижимого имущества в соответствии с заключенным договором купли-продажи.
Передача объекта недвижимого имущества производится в течение 5 рабочих дней с момента оплаты 20% его стоимости и предоставления покупателем банковской гарантии (при этом передаваемый объект недвижимого имущества не признается находящимся в залоге у ОАО «Белинвестбанк»)

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21.07.2016 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **19.08.2016 в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 29А** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **17.08.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»**, г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | **УП «СВ КЛАСС»**, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 142-Г |

**Предмет аукциона**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Лот №1** | | | |
